№ 13 (611) 1 красавіка 2009 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

**Чаго Сідорскі прыватна лётаў у Франкфурт?**

Старонка 8



**Вяселле Пяткевіч і Мартыненкі**

Старонка 8

**«Слова пра паход Ігаравы» напісаў езуіт?**

Старонка 11

### У НУМАРЫ

**Колькі каштуе выпіць і закусіць у Беларусі і суседзяў**

У савецкія часы бутэлька гарэлкі каштавала 3 рублі 62 капейкі. За кілаграм свініны трэба было аддаць прыблізна столькі ж. А што цяпер? **Старонка 4**.

**«Усходняе партнёрства»: незавершаны гештальт**

Гэты інтэграцыйны праект стане альтэрнатывай СНД і ЕўрАзЭС. Піша аналітык Дзяніс Мельянцоў. **Старонка 5**.

**Філарэт і інтэрнэт**

Уладыка прапанаваў дзяржаве на заканадаўчым узроўні рэгуляваць інтэрнэт, як гэта робіцца ў Кітаі. **Старонка 3**.

**Настаўніцу звольнілі за Дзень Волі**

Дырэктарка цэнтру «SOL Minsk» Ванда Дармаян: «Гэта хлусня, што Мар'яну Груздзіловіч звольнілі за палітыку». **Старонка 2**.

**Маршруты па Беларусі: мяжа Усходу і Захаду**

Гомельска-берасцейскае памежжа — адзін з самых нязведаных і фантастычных акрайцаў краіны. Гранітныя скалы, азёры ў барах... Піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 12**.

# І вып'ем, і закусім




ЮЛІЯ РУЖАЧКА | GAZETABY.COM

**На фота: жанчына з самаробным плакатам на мітынгу 25 Сакавіка. Дзень Волі ў сталіцы. Старонка 6.**

**Беларусь запрасіла ў Расіі яшчэ 2 мільярды даляраў крэдыту.**

«Расія на гэтым этапе адмовіла» Беларусі ў крэдыце на 100 млрд расійскіх рублёў, перадалі ў аўторак інфармацыйныя агенцтвы са спасылкай на крыніцы ў Міністэрстве фінансаў Расіі. Яны ж паведамілі, што Мінск адразу запрасіў новы крэдыт — на 2 млрд даляраў.

Раней выказваліся меркаванні, што Расія абумоўлівае чарговую порцыю грошай прызнаннем Абхазіі і Асеціі. Якраз напярэдадні, 30 сакавіка, стала вядома, што пытанне аб гэтым не ўключана ў парадак дня сесіі палаты прадстаўнікоў.

Новы крэдыт на 2 мільярды беларускія ўлады просяць ужо не ад ураду РФ, а ад банкаў, але пад урадавыя гарантыі. Такое забеспячэнне патрэбнае, каб працэнт па крэдыце быў выгадны. Індэксы крэдытнага даверу да Беларусі невысокія, а памер золатавалютнага запасу нашай краіны ў прапорцыі да ВУП — найніжэйшы ў рэгіёне.

За апошнія паўтара году Беларусь атрымала ад Расіі міждзяржаўных крэдытаў на $3 млрд, у тым ліку $1,5 млрд за апошнія чатыры месяцы. Яшчэ 0,5 мільярда маюць прыйсці ад Крамля неўзабаве. Столькі сама Беларусь пазычыла ў Венесуэлы. 2,5 млрд вылучыў Міжнародны валютны фонд. Акрамя таго, Беларусь пазычала грошы ў Кітаю і прыватных банкаў.

У выпадку атрымання яшчэ 2 млрд даляраў ад расійскіх банкаў, агульная замежная запазычанасць Беларусі да канца 2009 году можа дасягнуць нават 23—25 мільярдаў даляраў. Яна расце хуткімі тэмпамі. На 1 студзеня 2007 году яна складала 6,8 мільярда, на 1 студзеня 2008 году — ужо 12,5 млрд.

Першыя вялікія выплаты па лукашэнкаўскіх крэдытах прыпадуць на 2011—2012 гады.

**Мікола Бугай**

## Запрасілі, але бачыць не хочуць

**Лукашэнка запрошаны ў Прагу на еўрапейскі саміт «Усходняга партнёрства», але з негалоснай умовай, што кулуарна папросяць прыехаць не яго, а іншага чыноўніка.**

27—28 сакавіка ў замку Глыбокае-над-Вэлтавай у паўднёвай Чэхіі, у доме продкаў міністра замежных справаў гэтай краіны Карэла Шварцэнберга, прайшла нефармальная сустрэча міністраў замежных справаў Еўрасаюзу. Галоўным пунктам праграмы спаткання было магчымае пашырэнне ЕС на шэсць балканскіх краін — Албанію, Боснію, Македонію, Чарнагорыю, Сербію і Харватыю. Сярод жа іншых тэмаў разглядалася пытанне запрашэння ў Прагу на саміт «Усходняга партнёрства» Аляксандра Лукашэнкі.

**Працяг на старонцы 3.**



# Настаўніцу звольнілі за Дзень Волі

**Дырэктарка адукацыйнага цэнтру SOL Minsk Ванда Дармаян: «Гэта хлусня, што Груздзіловіч звольнілі за палітыку».**

25 сакавіка з філіі брытанскага адукацыйнага цэнтру SOL Minsk была звольненая настаўніца ангельскай мовы Мар’яна Груздзіловіч. Паводле кіраўніцтва ўстановы, за сістэматычнае парушэнне працоўнага заканадаўства. Сама Мар’яна Рыгораўна лічыць, што звальненне звязанае з яе поглядамі.

25 сакавіка да жанчыны проста падчас заняткаў прыйшлі прадстаўнікі адміністрацыі кампаніі SOL. Яны папрасілі настаўніцу даць дзецям самастойнае заданне, а самой выйсці для нейкай важнай размовы.

«Я такая ўся задаволеная пабегла, бо думала, што гаворка пойдзе пра падрыхтоўку да майго юбілею. Аднак яны сказалі, што напярэдадні, 24 сакавіка, у мяне быў канфлікт на занятку, і ў Фрунзенскі аддзел адукацыі паступіла скарга, што на ўроках вядзецца палітычная агітацыя, а таксама ціск на псіхіку дзяцей. Я ўспомніла, што сапраўды ўчора адна дзяўчынка вельмі негатыўна выказалася пра Дзень Волі. Гэта калі зноў «збяруцца тупыя ўроды з апазіцыі і будуць нешта крычаць», сказала яна. Я проста запыталася, навошта ты так кажаш, калі там не бываеш? А я хаджу туды. І ходзяць туды інтэлігентныя, харошыя, мірныя людзі. На гэтым урок працягнуўся, але я бачыла, што дзяўчына пакрыўдзілася», — кажа М.Груздзіловіч.

Мар’яне Рыгораўне адразу заявілі, што яна падставіла ўсю кампанію, таму яны «вымушаныя прыняць адпаведныя меры». Гэта значыць, скасаваць працоўную дамову ў мэтах выратавання кампаніі. Прычым, звальненне адбылося імгненна. Спн.Груздзіловіч яшчэ запыталася, якія менавіта дзеці паскардзіліся сваім бацькам, але прадстаўнікі адміністрацыі адказалі, што самі не бачылі гэтага ліста. Настаўніца потым яшчэ скончыла свой апошні занятак у SOL.

Спадарыня Груздзіловіч звяртае ўвагу, наколькі хутка былі сабраныя подпісы, калі тыя подпісы — насамрэч праўда. «Вечарам 24-га я правяла той занятак, а на раніцу наступнага дня была складзеная «калектыўная» скарга на мяне. Завуч потым у прыватнай размове сказала, што тата ў дзяўчынкі — палкоўнік МУС».

Сама Мар’яна Груздзіловіч нарадзілася ў Расіі, дзе адвучылася да пятага класа, потым жыла ў Брэсце, дзе была вызваленая ад вывучэння беларускай мовы. Тым не менш, жанчына падтрымлівае дэмакратычны рух, ходзіць на акцыі апазіцыі. Вось толькі сёлета праз гэтыя праблемы на працы не змагла трапіць на Дзень Волі.

«Цяпер кіраўніцтва кажа, нібыта яны ведалі ад самага пачатку, што я ў шэрагах БНФ, і заплюшчвалі на гэта вочы, але гэта поўнае трызненне, бо ні ў якіх партыях я ніколі не была. Яны не могуць паверыць, што я хаджу на мітынгі не па разнарадцы, а ад поклічу душы», — кажа настаўніца.


Юлія Дарашкевіч

Потым спн.Мар’яна паказала фотаальбом, які рыхтавала да пяцідзесяцігоддзя і які павінны былі ўбачыць калегі і начальства. У альбоме, у тым ліку, здымкі з вулічных акцый. «Я ніколі не хавала сваёй пазіцыі. Вось вы бачыце Дзень Волі 2007 году, прайшлася побач з Мілінкевічам ад кінатэатру «Масква» да Акадэміі навук. І гэтым вельмі ганаруся».

Кампанія SOL у Мінску адкрылася 17 жніўня 1998 году і Мар’яна Груздзіловіч ад першых дзён пачала сваю працу там. «Многія тады пабаяліся адразу пайсці ў штат, працавалі на паўстаўкі. А я такі чалавек, што магу быць адданая толькі чамусьці аднаму. Дырэктар кампаніі праз гэта заўсёды ставіла мяне ў прыклад». Праз нейкі час кампанія адкрыла філію, у СШ №212, побач з домам настаўніцы.

Па каментар адносна звальнення Мар’яны Груздзіловіч мы звярнуліся да дырэктаркі філіі Ванды Дармаян: «Выкладчыца была звольненая за сістэматычнае парушэнне працоўнага заканадаўства. Бывалі выпадкі, што яна даводзіла дзяцей да нервовых зрываў, абражала. Гэта хлусня, што яе звольнілі за палітыку. Бывалі выпадкі, што яна адмяняла заняткі, не ўзгадніўшы з кіраўніцтвам», — кажа В.Дармаян.

**Муж Мар’яны Груздзіловіч**

Алег працуе журналістам радыё «Свабода».

«Не было ніякіх скаргаў! — пратэстуе настаўніца. — Гэта ішоў адзінаццаты год маёй працы, але нічога падобнага ніколі не было. Дзеці мяне любяць, я іх таксама люблю, работу люблю. Заходжу ў інтэрнэт, пампую здымкі, раздрукоўваю, прыношу ім. Мой муж часам кажа, што есці не згатавана, а я сяджу і нешта выразаю для дзяцей, рыхтуюся да заняткаў. Каб ім цікава было, каб хацелі хадзіць», — адказвае на гэтыя закіды звольненая.

Мар’яна Груздзіловіч расказвае, што летась, калі адзначалася 10-годдзе SOL Minsk, кіраўніцтва кампаніі ўзнагародзіла настаўніцу падарожжам на дваіх у Парыж на восем дзён. «Узнагародзілі за маю працу, за вернасць, за адданасць кампаніі. Калі б я штосьці парушала, ды яшчэ сістэматычна, дык ці зрабілі б такі дарагі падарунак?».

У той самы дзень, калі стала вядома пра звальненне Мар’яны Груздзіловіч, людзі пачалі накіроўваць дзесяткі электронных лістоў у мінскую філію кампаніі, а таксама ўласна ў Вялікабрытанію з патрабаваннем аднавіць жанчыну на працы. Толькі на сайце nn.by было змешчана больш за 120 водгукаў у падтрымку звольненай настаўніцы. Некаторыя прапаноўваюць ёй рэпетытарства ў сваіх дзяцей. З першых адказаў ад брытанскай кампаніі стала вядома, што яны атрымалі 130 э-мэйлаў за першы ж дзень кампаніі салідарнасці.

За часы кіравання Лукашэнкі звальненні людзей з працы за палітычныя погляды сталі вельмі распаўсюджанай з’явай.

**Зміцер Панкавец**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Цана «НН» зніжаецца да 1500 рублёў

Дзякуючы росту тыражу «Нашай Нівы» знізіўся сабекошт газеты. Таму ад красавіка газета будзе прадавацца ў кіёсках за **1500 рублёў**. Столькі сама будзе каштаваць цана падпіскі аднаго нумару праз Рэдакцыю. Адпаведна, цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складзе ад красавіка **6000 рублёў**. Цана падпіскі праз «Белпошту» адпаведна знізіцца ад 1 ліпеня.

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Касір | Агулам

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Касір М.П. | Агулам

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**
дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**С.К., Ю.Л., Сяргею У., Кірылу М., М.Б., А.Р., Наталлі М., Антаніне К., Мікалаю У., Міхаілу Ж., М.К., Івану К., Т.Р., Уладзіміру Ч., А.С., Ірыне М., Т.П., С.Ц.** з Мінску.
**Віктару А.** з Гомелю.
**Ірыне З.** з Смалявіцкага раёну.
**Андрэю М.** з Полацкага раёну.
**Уладзіміру Ш.** з Віцебскага раёну.
**П.Г.** з Лагойскага раёну.
**Мікалаю Р.** з Аршанскага раёну.
**Паўлу С.** з Горацкага раёну.
**Сяргею Р., Тамары Ш.** з Бярозаўскага раёну.
**Іне С., В.Д.** з Барысаўскага раёну.

# Запрасілі, але бачыць не хочуць

**Працяг са старонкі 1.**

Пасля першага дня працы прыйсці да адзінага меркавання адносна Лукашэнкі міністры так не змаглі. Як і раней, найбольш жорсткую пазіцыю займаў кіраўнік замежнапалітычнага ведамства Галандыі Максім Ферхаген. Ён выказваўся з той пазіцыі, што падобнае запрашэнне стане своеасаблівым заплюшчваннем вачэй на сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі. Паводле Ферхагена, «Лукашэнку нельга даваць палітычнай трыбуны».

Пра сваю заклапочанасць сітуацыяй заявіў таксама кіраўнік МЗС Швецыі Карл Більт. Наколькі нам вядома, Швецыя ўстурбаваная арыштам Мікалая Аўтуховіча і іншых ваўкавыскіх прадпрымальнікаў.

У выніку дэбатаў было прынятае кампраміснае рашэнне — даслаць Лукашэнку запрашэнне, але з негалоснай умовай, што ў Прагу прыедзе не ён, а іншы беларускі чыноўнік. Ці міністр Мартынаў, ці нехта яшчэ. Толькі на такі варыянт згадзіліся Нідэрланды. У адваротным выпадку яны абяцалі жорсткую публічную крытыку Лукашэнку. Скандалу ж не хоча ніхто.

Еўракамісар Беніта Ферэра-Вальднэр, каментуючы вынікі сустрэчы ў Чэхіі, адзначыла, што гаварыць пра такі варыянт як вырашаны пакуль рана. Перад травеньскім самітам Мінск павінна наведаць сама спн.Ферэра-Вальднэр, а таксама дэлегацыя Еўрапарламенту, каб ацаніць стан з правамі чалавека ў краіне. Таму і рашэнне канчаткова будзе прынятае незадоўга да самой сустрэчы.

Нават такое кампраміснае рашэнне еўрапейскіх міністраў выклікала крытыку некаторых апазіцыйных палітыкаў. Аляксандр Казулін заявіў, што некаторым прагматычным еўрапейцам яшчэ будзе сорамна. «Камусьці хочацца заплюшчыць вочы на маральныя каштоўнасці і працягваць падлашчвацца да апошняга дыктатара Еўропы», — сказаў А.Саннікаў. «Запрашэнне Лукашэнкі ў Прагу — палітычная памылка Брусэлю», — так ацаніў гэтыя падзеі Анатоль Лябедзька. «Калі Еўропа хоча мець адносіны з хамам, то няхай запрашае. Я мяркую, што такі палітык у Празе непатрэбны», — адсёк Сяргей Калякін. Мілінкевіч прамаўчаў, Севярынец заявіў: «Калі яны хочуць размаўляць з Лукашэнкам наўпрост, не толькі ў Мінску, але і ў еўрапейскіх сталіцах, гэта іхняе права і іхні выбар. Але яны павінны здаваць сабе справу, што і за прапаганду ў Беларусі пасля такіх сустрэчаў, і за наступствы саміх візітаў еўрапейцы будуць адказныя».

Тым часам адзін з удзельнікаў сустрэчы ў Глыбокім, міністр замежных справаў Іспаніі Мігель Марацінас ужо паспеў наведаць Мінск, дзе правёў перамовы з Мартынавым і Лукашэнкам.

«Іспанія вельмі зацікаўлена ў тым, каб яе старшынства ў Еўрасаюзе пачалося з поўнай нармалізацыі адносін паміж Мінскам і Брусэлем, — заявіў дыпламат пасля сустрэчы з беларускім калегам. — Мы павінны цалкам пакончыць з санкцыямі, якія з'яўляюцца механізмамі ўчарашняга дня».

«Знаходзячыся ў цэнтры Еўропы, мы хацелі б самых добрых адносін з нашымі суседзямі — Еўрапейскім саюзам», — усцешыўся Лукашэнка пасля гутаркі з Марацінасам.

Тым часам у дзень прылёту міністра Марацінаса стала вядома, што ў парадак дня веснавой сесіі парламенту не было ўключанае пытанне прызнання незалежнасці сепаратысцкіх каўказскіх дзяржаваў — Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Зусім не факт, што яго так і не разгледзяць. Але Еўропе ўсё адно прыемна.

**Зміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Далікатная задача данесці да Аляксандра Лукашэнкі, што ў Прагу яму лепш не ехаць, выпала міністру замежных справаў Іспаніі Мігелю Марацінасу.**

**Асаблівае меркаванне Мілінкевіча**

Лідэр Руху за Свабоду Аляксандр Мілінкевіч мае адрозную ад сваіх калег пазіцыю на паляпшэнне адносінаў афіцыйнага Мінску і Брусэлю.

«Тая палітыка, якую праводзіць Еўрасаюз у дачыненні да Беларусі праз «Усходняе партнёрства» — гэта новы крок у нашых стасунках. Я шчаслівы, што ў ЕС з'явілася такая стратэгія адносна Беларусі. І гэта выдатны шанец для нашай краіны», — сказаў А.Мілінкевіч.

Палітык зазначыў, што парушэнні правоў чалавека ёсць ва ўсіх шасці краінах, якія запрошаныя ва «Усходняе партнёрства», але Еўропа выбрала шлях дазаванага перніка, а не пугі.

«У Беларусі, Малдовы і Украіны з'яўляюцца выдатныя магчымасці ўступіць у Еўрасаюз. Беларусі замінае аўтарытарызм, але ў пытаннях эканамічнага, навуковага развіцця, адукацыі мы маем нават лепшыя пазіцыі, чым дзве іншыя краіны», — сказаў ён.

Мілінкевіч расказаў, што напярэдадні меў дзвюхгадзінную сустрэчу з Аляксандрам Казуліным. «У нас супрацьлеглыя пазіцыі. Я за супрацоўніцтва з Еўрасаюзам, Казулін — за ізаляцыю. Я бачу пагрозу для незалежнасці, а Казулін не бачыць», — сказаў лідэр Руху за Свабоду.

Мілінкевіч таксама быў самакрытычным, гаворачы пра апазіцыю: яна слабая і раз'яднаная, не ўплывае на грамадства.

І няма чаго радавацца эканамічнаму крызісу, які насоўваецца на Беларусь, дадаў ён. «Гэта несумленна. Таксама не думаю, што крызіс прывядзе да дэмакратыі. Ён можа дэстабілізаваць сітуацыю, і гэтым мае шанцы скарыстацца Расія», — зазначыў А.Мілінкевіч.

# Філарэт і інтэрнэт

**Падчас сустрэчы Лукашэнкі з Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы Уладыка Філарэт нечакана запрапанаваў дзяржаве на заканадаўчым узроўні рэгуляваць інтэрнэт з арыентацыяй на кітайскі досвед.**

«Кітайскі досвед цікавы тым, што адказнасць за выкарыстанне інтэрнэту ўскладзена не на дзяржаву, а на тых, хто прадстаўляе доступ у сеціва», — цытавалі словы мітрапаліта дзяржаўныя агенцтвы.

З яго словаў, «асноўная пагроза заключаецца ў тым, што ўсялякага роду немаральная інфармацыя стала даступнай дзецям і падлеткам. Для іх віртуальны хаос вельмі небяспечны».

Раней пра «кітайскі досвед» гаварылі былы галоўны ідэолаг краіны Алег Пралескоўскі і намесніца міністра інфармацыі Лілія Ананіч. Падчас падрыхтоўкі новага закону аб СМІ Лілія Ананіч зазначыла, што ў краіне існуе праблема дэзінфармацыйных патокаў замежных сайтаў, якія ставяць за мэту дэструктыўна ўплываць на працэсы, што адбываюцца ў Беларусі. «Але ёсць досвед Кітаю, які перакрыў доступ такіх сайтаў на сваю тэрыторыю. І, канечне, у першую чаргу неабходны якасны рост нацыянальнага інтэрнэт-рэсурсу, які працуе на дабро краіны», — лічыць Л.Ананіч.

Урэшце, праект рэгулявання інтэрнэту быў перададзены Савету міністраў, аднак ніякіх канкрэтных прапановаў там так і не зрабілі. На гэтым праект і завіс.

Цікава, што ад словаў Філарэта вырашыла абмежавацца РПЦ. Кіраўнік службы камунікацыі Аддзелу замежных царкоўных сувязяў Маскоўскага патрыярхату Міхаіл Пракапенка заявіў аб, «прынамсі, насцярожанасці» з прычыны ініцыятывы мітрапаліта Філарэта.

У Расійскай праваслаўнай царкве прызнаюць важнасць і неабходнасць барацьбы са злачыннасцю ў інтэрнэце, але заклікаюць не бачыць у магчымым узмацненні кантролю над сусветным сецівам галоўную зброю ў барацьбе з грамадскімі заганамі.

Што ж такое кітайскі досвед рэгулявання інтэрнэту, на які так спасылаюцца Ананіч і Філарэт? Чым ён розніцца ад, скажам, нямецкага ці шведскага? У большасці дэмакратычных краінаў адпаведныя органы маюць права зачыніць або блакаваць інтэрнэт-старонкі, якія парушаюць закон. І такое ўжываецца супраць сайтаў, напрыклад, з дзіцячай парнаграфіяй або якія збіраюць грошы на Аль-Каіду. У Кітаі ж уведзена сістэма фільтрацыі ўсяго зместу.

Улады Пекіна блакуюць доступ да непажаданых старонак (напрыклад, дзе пішуць, што ў Кітаі дыктатура, ці заклікаюць змагацца з разбуральнымі для экалогіі гаспадарчымі праектамі ўладаў). Больш за тое, вялікі кітайскі фаервол — «Джындун гончэнь», або «Залаты шчыт», як называўся гэты праект коштам 800 мільёнаў даляраў, — яшчэ і збірае інфармацыю пра камп'ютары, з якіх выходзяць запыты на забароненыя сайты.

Кожныя паўгадзіны анімаваныя паліцэйскія з'яўляюцца на экранах тых карыстальнікаў, якія наведваюць найбуйнейшыя дзяржаўныя сайты. Яны засцерагаюць людзей ад наведвання непажаданых старонак і нагадваюць, што за імі сочаць у рэжыме онлайн.

Каментатар часопісу ARCHE нагадаў мітрапаліту Філарэту, што Кітай блакуе і хрысціянскія сайты. «Для грамадзян Кітаю заблакаваны доступ не толькі да сайтаў шматлікіх заходніх і нават расійскіх газет, часопісаў, радыё- і тэлекарпарацый, але і да хрысціянскіх інфармацыйных рэсурсаў: каталіцкіх, пратэстанцкіх і праваслаўных», — піша ён.

Каментатар сайту nn.by, у сваю чаргу, лічыць, што выказванне мітрапаліта можа быць сігналам аб падрыхтоўцы грамадскае думкі да абмежавання распаўсюду інфармацыі ў нэце перад наступнымі прэзідэнцкімі выбарамі. Мауляў, не скурны інтарэс адная палітычнае групоўкі стаць за імкненнем фільтраваць трафік па ключавых словах, а клопат пра духоўнасць і абарону ад распусты.

**ЗП**

# Колькі каштуе выпіць і закусіць у Беларусі і суседзяў

| СТАЛІЦА | ГАРЭЛКА (0,5 л) | ЦЫГАРЭТЫ (пачак) | СВІНІНА (1 кг) | МАБІЛЬНЫ за хвіліну |
|---|---|---|---|---|
| Мінск | 6700 | 3200 | 23 000 | 45 |
| Варшава | 15 500 | 7530 | 13 000 | 300 |
| Кіеў | 6500 | 2650 | 21 000 | 35 |
| Масква | 7500 | 3700 | 18 000 | 207 |
| Вільня | 16 500 | 6600 | 20 500 | 197 |




У савецкія часы бутэлька гарэлкі каштавала 3 рублі 62 капейкі. Гэтая нязменная «магічная» лічба надоўга засталася ў памяці людзей. Але галоўнае не гэта. За кілаграм свініны трэба было аддаць прыблізна столькі ж. Выбар між тым, выпіць з сябрамі ці прынесці дадому мяса, быў роўным. А што цяпер?

«Наша Ніва» параўнала цэны ў Беларусі і ў суседніх краінах. У цэнтры нашай увагі апынуліся бутэлька гарэлкі, пачак якасных цыгарэт (Marlboro), кілаграм свініны (выразкі) ды хвіліна размовы па мабільным. Трэба ўлічваць, што падлікі ў нейкай ступені ўмоўныя. Цэны ў звычайнай краме і дыскаўнтэры розняцца на парадак. Розняцца і тарыфы.

Адразу ж кідаецца ў вочы, што Мінск і Кіеў шмат у чым падобныя. І там, і там вельмі танныя гарэлка і цыгарэты. І ў той жа час самае дарагое мяса. Кілаграм свініны даражэйшы за тры бутэлькі гарэлкі! Размовы па мабільным тэлефоне ўнутры сеткі ў Беларусі вельмі танныя. Гэта ледзь не адзінае, чым мы можам ганарыцца.

Цыгарэты ва Украіне надаўна падаражалі, раней яны каштавалі яшчэ танней і часта нелегальна экспартаваліся ў суседнія краіны — тую ж Польшчу.

Краіны Еўрасаюзу — з прыведзенага спісу гэта Літва і Польшча — усталявалі такія высокія цэны на тытунь і алкаголь, што гэта мусіць дзейнічаць лепш за ўсю антыалкагольную сацыяльную рэкламу ў Беларусі. У Варшаве мяса таннейшае за бутэльку гарэлкі. Выпіваць проста нявыгадна! Як, зрэшты, і курыць — цэны кусаюцца. Польшча пацвярджае званне «мясной» дзяржавы. Тут самая танная свініна з усіх прыведзеных у спісе краін.

Расія знаходзіцца дзесьці між двух бакоў. Яна вельмі далёкая ад савецкага правіла «гарэлка = мяса», але прапорцыі не такія вялікія, як у нас і ўкраінцаў. Па цэнах мабільная сувязь у расіян на еўрапейскім узроўні.

Жыццё гэтым днём выгаднае для дзяржавы, бо абарот таннага алкаголю атрымліваецца прост агромністым. За студзень і люты 2009 году ў краіне былі прададзеныя 1,379 мільёна літраў алкаголю ў пераліку на чысты алкаголь. Боязь выклікаць незадаволенасць спажыўцоў алкаголю і зменшыць прыбыткі бюджэту пакуль пераважвае разуменне неабходнасці аздараўляць нацыю.

**Ягор Марціновіч**

## Афіцыйны сярэдні заробак «надзімаюць» у справаздачнай дакументацыі

Прадстаўнік Беларускага незалежнага прафсаюза на Гродзеншчыне Анатоль Хацько выявіў: статыстыка сярэдняга заробку выводзіцца цяпер з колькасці рэальна адпрацаваных дзён за месяц, то бок фактычна размова не пра сярэднямесячны заробак!

Вось тлумачэнне, так бы мовіць, «на пальцах»: калі рабочы працаваў два дні на тыдзень, то гэты сярэдні двухдзённы для статыстыкі памнажаецца на пяць... Па статыстыцы — як і раней маем, а ў жыцці даводзіцца ўціскацца.

Адначасова дзеля выратавання ўсё таго ж «дзьмутага» сярэдняга заробку актыўна праводзіцца палітыка так званага «ціхага» звальнення — чым менш людзей, тым «сярэдні» зноў жа вышэй.

Чыноўнікі могуць гэты аргумент парыраваць: маўляў, гляньце на біржы працы — нямашака народу!

Людміла Крэз, намеснік кіраўніка аддзелу працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Гродзенскага аблвыканкаму, дырэктар цэнтра занятасці аптымістычна сведчыць: колькасць шукальнікаў працы нават зменшылася ў параўнанні з мінулым годам.

Але гэта — проста хітрыкі. Людзі ў працаўладкаванні спадзяюцца ў асноўным на сябе. А хто асабліва пабяжыць на біржу працы — дапамога па беспрацоўі мізэрная, толькі на адпрацоўкі хадзі. Вось і цягнецца звольнены люд у скрытныя сектары эканомікі.

Толькі з заводу аўтаматычных агрэгатаў, які ў мінулым годзе стаў структурным падраздзяленнем «Белкарда», за апошнія месяцы звольнілася каля 60 рабочых, бо мелі ўсяго па 200-300 тысяч.

Прычым калі раней высокакваліфікаваных станочнікаў, токараў, фрэзероўшчыкаў хіба ці не сілком утрымлівалі на прадпрыемстве, то цяпер да звальнення кіраўнікі ставяцца як ад збаўлення галаўнога болю.

Каб не нарабіць сабе шкоды, людзі маўчаць.

Вось толькі бурбалкамі сыты не будзеш.

**Алесь Васількоў, regionby.org**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Без чаргі не выйдзе

Ільготныя крэдыты ўсёй чарзе на жыллё аказаліся пад пытаннем.

Яшчэ ў сярэдзіне студзеня мінскія ўлады прынялі рашэнне №101, якое дазволіла выдаваць ільготныя 5%-авыя крэдыты тым, хто стаіць у чарзе на паляпшэнне ўмоваў жылля, незалежна ад таго, прыйшла іх чарга ці не. Сям'я магла прэтэндаваць на крэдытаванне 50% цаны кватэры.

Толькі потым высветлілася, што Мінгарвыканкам не да канца разабраўся ў сітуацыі. Яго пастанова супярэчыць прэзідэнцкаму ўказу дзевяцігадовай даўніны, у якім сказана: «Льготныя крэдыты даюцца толькі па чарзе».

Але людзі, натхнёныя навіной, якую растыражавалі СМІ, ужо настроіліся на лепшае. Узрадаваныя тым, што ім не давядзецца чакаць 20 гадоў у чарзе, некаторыя паспелі заключыць дамовы з забудоўшчыкамі і нават унесці першыя выплаты. Чым разлічвацца цяпер, калі крэдытаў не выдаюць, яны не ведаюць.

Намеснік прэм'ер-міністра Віктар Бура заклікае не спяшацца з высновамі:

— Пытанне будзе дадаткова вывучана наконт яго юрыдычнай карэктнасці.

У сталіцы ў чарзе на льготнае жыллё стаіць каля 250 тысяч чалавек.

**ЯМ**

## СЦІСЛА

### Нядоўга МТС займаўся папулізмам

Мабільны аператар МТС з 31 сакавіка адновіць дзеянне большых тарыфаў, што былі паніжаныя на ўказанне Мінэканомікі з 25 лютага. Паніжаныя тарыфы пратрымаліся месяц.

### Цукар падаражаў на 5%

Мінэканомікі павышае цэны з-за цяжкага стану цукраапрацоўчых арганізацый. Цяпер цукар, расфасаваны ў кілаграмовыя пакеты, каштуе 2210 рублёў.

### Аздараўленне эканомікі пачнецца ў 2010-м

Мяркуе былы кіраўнік Нацбанку Станіслаў Багданкевіч. Ён бачыць рэзерв эканомікі Беларусі ў развіцці ўнутранага рынку.

### Элітныя офісы незапатрабаваныя

У Мінску пустуюць каля 20% офісаў найвышэйшага класу. Пры гэтым у планах гораду — будаўніцтва шэрагу новых дзелавых цэнтраў кшталту «Мінск-Сіці».

### Тэрміны вяртання крэдытаў на жыллё павялічаць

Пакуль грошы пад жыллё даюцца на 15 гадоў, а льготныя крэдыты разлічаныя на 20 гадоў.

### Даляр вяртаецца

У панядзелак на таргах БФВБ амерыканская валюта падаражэла ажно на 43 рублі, афіцыйны курс на 31 сакавіка стаў 2837 рублёў.

### Кірмаш вакансій у Мінску

Заробкі вагаюцца ад 150 тыс. прыбіральшчыцы да 1,5 млн рублёў галоўнаму бухгалтару.

### Нарвежская крона — найлепшая валюта

Аналітыкі HSBC апублікавалі доследы, якая валюта самая ўстойлівая. Аказалася — нарвежская крона. За апошнія чатыры месяцы 2008 г. яна вырасла на 20% да даляра. Стабільнасць Нарвегіі грунтуецца на $350 мільярдах інвестыцыйнага фонду, заробленага на продажы нафты.

**ЯМ**

## Экспарт працягвае ляжаць

У студзені—лютым Беларусь скараціла экспарт тавараў на 47,8%, імпарт — на 32,1%, дэфіцыт гандлёвага балансу вырас у 2,5 разы проці 2008 году.

Гэта паведамляе Белстат. У студзені—лютым мінулага году дэфіцыт складаў 436 млн даляраў. За два месяцы гэтага году ён узрос да 1100 млн.

**ЯМ**

# «Усходняе партнёрства»: незавершаны гештальт

**Гэты інтэграцыйны праект стане альтэрнатывай СНД і ЕўрАзЭС. Піша аналітык Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў Дзяніс Мельянцоў.**

20 сакавіка на саміце ЕС ў Брусэлі была канчаткова ўхвалена палітыка «Усходняга партнёрства» ЕС. Беларусь стала ўдзельніцай «Усходняга партнёрства» без аніякіх папярэдніх патрабаванняў і на цалкам раўнапраўных умовах. Разам з тым, усё яшчэ застаецца інтрыга з запрашэннем Аляксандра Лукашэнкі на інаўгурацыйны саміт УП, які мае адбыцца ў маі.

Удзел ва ўсіх праектах «Усходняга партнёрства» — не аднаразовая працэдура. Глыбіня інтэграцыі залежыць ад жадання і намаганняў краінаў-удзельніц. І бязвізавы рэжым, і ўдзел у эканамічнай прасторы, і дамовы пра асацыяцыю для кожнай з шасці краін будуць знаходзіцца ў залежнасці ад адаптацыі да еўрапейскага заканадаўства і супольнасці.

Іншымі словамі, ЕС збіраецца рэалізаваць класічную палітыку абумоўленасці, але з нюансам – у адрозненне ад цэнтральнаеўрапейскіх дзяржаваў, усходнееўрапейскай шасцёрцы не прапануецца сяброўства ў ЕС. Наадварот, УП павінна стаць заменай сяброўству пры адначасовай уключанасці ў еўрапейскія інтэграцыйныя працэсы на дастаткова глыбокім узроўні.

**Уключэнне Беларусі ў УП на раўнапраўных умовах можна разглядаць як значны аванс для беларускага кіраўніцтва.**

Выгады УП для Беларусі большыя, чым можна было чакаць. Палітыка абумоўленасці можа стаць цалкам працоўным механізмам кантраляванага збліжэння Беларусі з ЕС.



Уключэнне Беларусі ў УП на раўнапраўных умовах можна разглядаць як значны палітычны аванс для беларускага кіраўніцтва. ЕС без дадатковых перадумоваў уключыў Беларусь у свой рэгіянальны інтэграцыйны праект, які мусіць стаць альтэрнатывай СНД і праекту Адзінай эканамічнай прасторы. Афіцыйны Мінск у некалькі разоў пашырае сваё поле для манеўру і падвышае сваю вагу ў геапалітычнай гульні.

У той жа час ЕС інкарпараваў у праект УП каштоўнасны блок, што ўзмацняе яго інструменты ўплыву на працэс палітычнай трансфармацыі ў постсавецкай шасцёрцы.

Незалежна ад удзелу ці няўдзелу прэзідэнта Беларусі ў саміце УП Беларусь ужо ўключылася ў працэсы, якія будуць аказваць доўгатэрміновы ўплыў на ўнутраную і замежную палітыку Мінску. Палітычны дыялог з ЕС будзе працягвацца.

## Заўвагі і тлумачэнні па артыкуле Аляксандра Чубрыка «Лукавыя лічбы», надрукаваным ў газеце «Наша Ніва» (ад 17 сакавіка)

Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь лічыць неабходным адзначыць, што спадар Чубрык у артыкуле «Лукавыя лічбы» прывёў недакладныя дадзеныя (дэфлятар ВУП за студзень 2009 г.), пры гэтым выказваючы «вялікі дзякуй Белстату» за прадастаўленую інфармацыю.

На сайце Белстату і ў штомесячных публікацыях прыведзеныя наступныя звесткі на гэты перыяд 2009 году: у студзені індэкс фізічнага аб'ёму ВУП адносна студзеня 2008 г. склаў 103,2%, дэфлятар 110,2%; у студзені—лютым, адпаведна: 102,3% і 110,4%.

Дэфлятар ВУП за студзень—люты 2009 г. (110,4%) спадар Чубрык называе «з разраду неймавернага». Аднак калі б спадар эканаміст паспрабаваў прааналізаваць гэтыя дадзеныя больш дэталёва, то ўсё стала б зразумелым.

Найперш спадару Чубрыку варта было б ведаць, што ў адпаведнасці з міжнароднай метадалогіяй пабудовы сістэмы нацыянальных рахункаў СНС–93 індэкс–дэфлятар ВУП прадстаўляе сабой адносіны ВУП, вылічанага ў бягучых цэнах, да аб'ёму ВУП, вылічанага ў пастаянных цэнах адпаведнага перыяду мінулага году. Такім чынам, спярша вылічваецца ВУП у бягучых цэнах і ў пастаянных цэнах, а потым шляхам дзялення гэтых паказчыкаў вызначаецца дэфлятар ВУП. ВУП у пастаянных цэнах разлічваецца як сума валавых дабаўленых коштаў усіх галін эканомікі і чыстых падаткаў на прадукты ў пастаянных цэнах, і ягоная велічыня не залежыць наўпрост ад дэфлятара. На велічыню дэфлятара ВУП уплываюць атрыманыя дэфлятары па асноўных галінах эканомікі.

Напрыклад, у прамысловасці, валавы кошт якой складае каля 30% у ВУП, у студзені 2009 г. дэфлятар склаў 97% (пры індэксе фізічнага аб'ёму 97,7%), у студзені—лютым — 96,7% (пры індэксе фізічнага аб'ёму 97,7%). Дэфлятар па прамысловасці атрымліваецца зыходзячы з аб'ёмаў прамысловай вытворчасці ў фактычных цэнах і індэксу фізічнага аб'ёму прадукцыі прамысловасці, разлічанага па наборы тавараў–прадстаўнікоў. Аб'ём прамысловай вытворчасці ў фактычных цэнах уключае ў сябе прамысловую прадукцыю, адгружаную на ўнутраны рынак і на экспарт. Такім чынам, дэфлятар адлюстроўвае змены цэнаў, а таксама структурныя ваганні аб'ёмаў прамысловай прадукцыі, адгружанай на ўнутраны рынак і на экспарт. Істотна паўплывала на дэфлятар прамысловасці ў студзені і лютым 2009 году змяншэнне аб'ёмаў і цэн на экспартаваную прадукцыю.

У сельскай гаспадарцы ў студзені і ў студзені—лютым 2009 году адносна адпаведнага перыяду 2008 году дэфлятар склаў, адпаведна: 126,5%; 123,3%; у будаўніцтве — 121,3%; 121,2.

Выкарыстаная спадаром Чубрыкам інфармацыі аб дэфлятары ВУП за студзень 2009 году адносна студзеня 2008 году на ўзроўні 119,6% якраз адносіцца да разраду неймавернага, паколькі атрымана з невядомай крыніцы.

Пры правядзенні аналізу статыстычнай інфармацыі і атрыманні значных разыходжанняў з афіцыйнымі дадзенымі, перш чым друкаваць недакладную інфармацыю і абвінавачваць статыстыку, варта было б звярнуцца па тлумачэнні да спецыялістаў Белстату.

Афіцыйная статыстыка ёсць даступнай і празрыстай, прадстаўляецца ў адкрытай і зразумелай форме. Усе публікацыі і метадалагічныя рэкамендацыі змяшчаюцца на сайце Белстату.

**Намеснік старшыні Белстату**
**Кухарэвіч Алена**

**Ад Рэдакцыі.** Выкарыстаная сп.Чубрыкам інфармацыя аб дэфлятары ВУП за студзень 2009 году адносна студзеня 2008 году на ўзроўні 119,6% была атрымана з інфармацыі агенцтва «Інтэрфакс», пададзенай са спасылкай на Белстат. Мы таксама разумеем, што Белстат аказваецца крайнім, што ён папросту вылічвае свае лічбы на аснове таго, што атрымлівае ад прадпрыемстваў і дзяржаўных ведамстваў.

Мы працягваем трымацца думкі, што змяншэнне індэкса-дэфлятара ўдвая ў 2009 проці 2008-га, неймавернае і належыць да разраду «палітычных цудаў». Нагадаем, што ў выніку такога зніжэння дэфлятара паводле афіцыйнай статыстыкі выходзіць, што ў Беларусі ў першыя два месяцы году не адбывалася падзення ВУП, а меў месца нават яго рост.

Што да пажаданняў звяртацца да спецыялістаў дзяржаўных органаў, то дзякуй за запрашэнне. Варта, аднак, адзначыць, што ў рэальнасці ў дзевяці выпадках з дзесяці яны адмаўляюць у інфармацыі прадстаўнікам незалежных СМІ.

## Хто крайні?

**Адказвае Аляксандр Чубрык.**

Падазронае стаўленне да нацыянальнай статыстыкі пра эканамічны рост — з'ява не толькі апошняга часу. Фактычна, ад самага пачатку росту ВУП — то бок ад 1996 году — ці мясцовыя эксперты, ці міжнародныя арганізацыі выказваюць сумневы наконт гэтага паказчыка. Аднак заззвычай усе нараканні на «фальсіфікацыі» ды «скажэнні» адрасуюцца Белстату, а раней — Мінстату. Тым часам адказ на пытанне «хто скажае статыстыку» зусім не такі відавочны. Паспрабуем разабрацца.

Эканоміка — гэта навука пра стымулы (як і іншыя навукі пра чалавека). Калі спрошчана, то справа з статыстыкай выглядае так: дзяржава стварае інстытуты, то бок правілы, якія акрэсліваюць адносіны паміж статыстычнымі органамі ды прадпрыемствамі, і правілы, якія акрэсліваюць адносіны паміж прадпрыемствамі ды не-статыстычнымі органамі ўлады (напрыклад, Міністэрствам прамысловасці, канцэрнамі і г.д.). Гэтыя інстытуты ўплываюць на паводзіны ўсіх апісаных агентаў. Зараз — простая эканамічная мадэль.

Органы ўлады «даводзяць» прадпрыемствам планы (прагнозы) тэмпаў росту вытворчасці, за невыкананне якіх дырэктар прадпрыемства можа пазбавіцца пасады (ці нават горш).

Органы статыстыкі патрабуюць ад прадпрыемстваў справаздач пра тэмпы росту вытворчасці, за няправільнае запаўненне якіх кіраўніцтва прадпрыемстваў нясе адказнасць (таксама даволі жорсткую).

Такім чынам, калі прадпрыемства палічыла вытворчасць меней, чым гэтага патрабаваў план, перад яго кіраўніцтвам паўстаюць дзве альтэрнатывы:

1) казаць праўду ці

2) займацца прыпіскамі.

У першым выпадку пакаранне амаль непазбежнае. У другім — толькі імавернае (калі праверка высветліць факт прыпісак). І тут трэба ўлічыць дзве акалічнасці.

Па-першае, шмат якія прадпрыемствы маюць вялізны досвед вельмі «пісьменных» прыпісак, які атрымалі яшчэ за савецкім часам. Па-другое, нават прадстаўнікі прыватнага бізнэсу адзначаюць, што час ад часу органы ўлады просяць іх паказаць «патрэбныя» лічбы (напрыклад, паказаць меншы рост вытворчасці ва ўдалы год, каб на наступны год, які можа апынуцца няўдалым, было адкуль гэты рост браць).

Улік гэтых акалічнасцяў дазваляе сказаць, што імавернасць пакарання за скажэнні статыстыкі змяншаецца, бо іх цяжка выкрыць, а выкрываць іх не заўжды хочуць.

Такім чынам, з пункту гледжання кіраўніка прадпрыемства ў цяжкія часы прасцей сказіць статыстыку, чым не выканаць плану. З гэтага вынікае, што Белстат, які карыстаецца міжнароднай метадалогіяй ацэнкі ВУП, прамысловай вытворчасці і інш., можа атрымліваць непраўдзівыя першасныя дадзеныя ад прадпрыемстваў, і тады ніякая міжнародная метадалогія не ўратуе лічбы ад скажэння.

Такім чынам, калі вас агортвае сумнеў наконт праўдзівасці афіцыйных звестак, няправільна рабіць «крайнім» Белстат. Большасць яго прадстаўнікоў — прафесіяналы, якія маюць вялікі досвед ды веды міжнародных статыстычных стандартаў і якія таксама адказныя перад законам за праўдзівасць інфармацыі. Калі ў 2005 годзе МВФ і Сусветны банк правяралі адпаведнасць беларускіх дадзеных метадалогіі, яны амаль не знайшлі «нестыковак». Крайняя — сістэма, якая скажае стымулы прадпрыемстваў і органаў дзяржаўнага кіравання, робячы прыгожую хлусню больш прывабнай за горкую праўду.

# Жывы ланцуг і спіралі Бруна

Вынікі святкавання 25 Сакавіка ў Мінску аналізуе **Барыс Тумар**.

Улады правялі поўнамаштабную дэманстрацыю сілы.

У цэнтр гораду былі сцягнутыя Унутраныя войскі. На дахах будынкаў сядзелі снайперы. На відне стаялі дзесяткі аўтазакаў і нават — навінка сезону — спіралі Бруна: скруткі калючага дроту, якім можна было перагарадзіць праспект, калі б дэманстрацыя рушыла ў цэнтр гораду. Тым не менш, больш за 3000 маніфестантаў, пераважна моладзь і пенсіянеры, сабраліся каля Акадэміі навук.

Арганізатары святкавання зрабілі арыгінальны крок. Каб не ісці на балотную плошчу Бангалор, што было б ганебна для нацыянальнага свята, і каб не правакаваць ужыцця сілы шэсцем у цэнтр гораду — яны заклікалі ўстаць ланцугом уздоўж праспекту. Людзі зрабілі тое з энтузіязмам. На праспекце запанавала самаарганізацыя. Удала быў выбраны і час: мінчукі якраз масава раз’язджаліся машынамі з працы. Шмат хто выказваў салідарнасць з дэманстрантамі аўтамабільнымі гудкамі.

Група моладзі з некалькіх соцень чалавек скіравалася ў бок цэнтру, але не пайшла на сутыкненні з амонаўцамі. Пры канцы акцыі, вярнуўшыся да Акадэміі навук, моладзь расклала вялікае вогнішча з партрэтаў Лукашэнкі і прапагандысцкае літаратуры.

Арганізатарам удалося элегантна перайграць улады. Жывы ланцуг глядзеўся эфектна, людзям падабалася тое, што яны робяць. Ужыццю сілы супраць такой падкрэслена мірнай акцыі немагчыма было б знайсці ніякага абгрунтавання.

Мяркуючы па складзе ўдзельнікаў свята, палітычнай апазіцыі не ўдалося данесці інфармацыю пра акцыю да шырэйшых колаў насельніцтва. Таксама відавочна, што наймяныя работнікі, якія трымаюцца за афіцыйную працу, не гатовыя рызыкаваць ёй і ўдзельнічаць у палітычных маніфестацыях. Звярнула ўвагу і тое, што самаробныя транспаранты, прынесеныя шараговымі ўдзельнікамі мітынгу, мелі пераважна сацыяльны характар — як вынік эканамічнага крызісу ў краіне.

Гэты Дзень Волі не паўплывае негатыўна на беларуска-еўрапейскія адносіны. Што датычыць сілы, арганізаванасці і матывацыі незалежнага грамадства, то сённяшняя акцыя была больш маштабнаю за аналагічныя ў міжчассі між прэзідэнцкімі выбарамі 2001 і 2006 гадоў.



ЮЛІЯ РУЖАЧКА \ GAZETABY.COM

**Гадзіну на праспекце панаваў дух свята.**




PHOTO.BYMEDIA.NET




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Маладафронтаўцы раздавалі сцяжкі з надпісамі «Лепшае — магчыма».**



SVABODA.ORG

**Вывучка і дысцыпліна.**



Ігар Варашкевіч (злева) і Мікалай Аруцюнаў.

# «Крама» — наша мама!

«Mein Vaterland, auf Wiedersehen» — «Крама» пачала свой вялікі сольны канцэрт з развітання. Карыстаючыся момантам, аглядаю публіку. Вельмі шмат сталых людзей — дзядзькі з доўгімі сівымі валасамі, жанчыны перадпенсійнага ўзросту. Мікалай Аруцюнаў ведаў, што казаў ў інтэрв'ю tut.by пра рок-н-рол як музыку 40-гадовых і старэйшых. Аднак было і многа маладых, нават дзяцей.

У залі былі родныя Варашкевіча. Першай сваёй жонцы ён прысвяціў «Будзь разам з намі», маці, якая нарадзілася ў Гомелі, натуральна, — «Гомельскі вальс». Як напамін пра студэнцкую маладосць, прагрымеў «Камендант». Песні пра каханне — дзве «Стэфкі», а калі быць шчырым, то першая — пранялі да хрыбта. Успомніліся такія далёкія, як падаецца цяпер, 1990-я, калі я са здзіўленнем адкрываў для сябе нашу музыку, і гэтае адкрыццё магутнай хваляй змывала-зносіла старыя мае захапленні, пераважна расійскія.

«А зараз мы вернемся ў СССР, але не трэба баяцца, бо гэта будзе толькі стары мульцік і па-беларуску: баю-бай, не кладзіся ты на край!» — пастрашыў і адразу ж супакоіў залю лідэр «Крамы» Ігар Варашкевіч.

Перад выхадам на сцэну свайго сябра і калегі Мікалая Аруцюнава Варашкевіч выканаў «Хавайся ў бульбу».

Першыя танцы каля сцэны пачаліся з першымі ж акордамі «Хворы на рок-н-рол». На сцэну выйшаў «сябра мой Вярэніч Лёнік». А за ім і Аруцюнаў. Лідэр расійскага Funky Soul зрабіў анонс: зараз будуць дзве песні Rolling Stone, дзве Lynyrd Skynyrd і дзве кампазіцыі гурту, які аб'ядноўвае два першыя гурты і робіць гэта па-беларуску — «Крамы». Пры гэтым Аруцюнаў катэгарычна заявіў, што дзве апошнія песні будзе спяваць таксама ён і на мове.

І тут пачалося! Калі раней адважных на ўсю залю было некалькі чалавек, і танчылі яны пераважна на балконах, то цяпер адрывалася ці не палова прысутных.

Аруцюнаў спяваў па-беларуску не горш за Пугача з «J:морс». І заля дзячыла яму апладысментамі і задаволенымі воклічамі. «Выпі са мной да дна» спявалі хорам і стоячы, пад «Бяжы, бяжы, хлопец» танчылі ўсе — і стары і малады, палітыкі і праваабаронцы, кабеты бальзакаўскага ўзросту і зусім маладзенькія дзяўчаты.

«Мы растапілі такі лёд гэтай афіцыйнай пабудовы! Цяжка тут працаваць», — прызнаўся лідэр «Крамы».

На біс прагучаў «Падае дождж».

«Парвалі залю!» — выгукнуў з шчаслівай усмешкай палітык Аляксей Янукевіч. І дадаў: «Крама» — наша мама!»

**Сямён Печанко**

## Гарачы чай вядзе да раку страваводу

**Калі вы ўжываеце вельмі гарачую гарбату (больш чым 70°С), гэта можа павялічыць рызыку ўзнікнення ў вас раку страваводу ў 8 разоў.**

Да такой высновы прыйшлі іранскія навукоўцы.

Яны правялі даследаванні ў правінцыі Галестан на поўначы Ірану, дзе зафіксаваны адзін з самых высокіх узроўняў у краіне захворванняў на рак страваводу. Жыхары гэтай правінцыі мала кураць і п'юць няшмат алкаголю, але п'юць многа гарбаты.

Навукоўцы прыйшлі да высновы, што ў параўнанні з цёплай гарбатай (да 65°С), спажыванне гарачай — вядзе да павелічэння рызыкі ўзнікнення раку страваводу.

**АГ**

## Як нас дураць у гіпермаркетах

Быў у нядзелю ў гіпермаркеце, які знаходзіцца ў Серабранцы. Набывалі з сяброўкай розныя пластыкавыя ёмістасці для кухні. Накупілі на тысяч 60. На касе разлічыліся, упакавалі. У машыне дзеля цікавасці паглядзелі адпаведнасці цэннікаў на таварах і чэку. І вось што высветлілася: адна ёмістасць, на якой быў наклеены цэннік 8700, у чэку лічылася як 10 150. А гэта ў розніцы каля 16%.

Прыйшоў на касу:

— Дзяўчына, а чаму цэннікі не супадаюць?

— Хутчэй за ўсё не паспелі зрабіць пераацэнку.

Канечне, 1,5 тыс. не грошы, але асадак застаўся...

**Паводле: Дзмітры Ласько, blogs.kp.by**




## Буслы прыляцелі

**Сёлета ў Беларусь раней вярнуліся белыя буслы. Гэта можа быць прыкметай спякотнага лета.**

У Беларусі жыве каля 13 тысяч пар белых буслоў. Гняздуюцца яны галоўным чынам у Палессі. Беларусь уваходзіць у пяцёрку еўрапейскіх краін, якія найбольш падабаюцца гэтым птушкам. Па колькасці параў Беларусь саступае толькі Польшчы, Украіне, Турцыі і Іспаніі, паведамляюць у таварыстве «Ахова птушак Бацькаўшчыны».

Сябры таварыства, якія шмат робяць, каб людзі шанавалі крылатых насельнікаў, адсачылі сёлета першага бусла на Гродзеншчыне 9 сакавіка. Гэта рана. Звычайна буслы прылятаюць паміж Дабравешчаннем паводле грыгарыянскага і юліянскага календароў.

**МБ**

# Конскі свіст і драпежныя цагліны беларускіх ультраправых

Пад такім загалоўкам надрукаваў рэцэнзію на альбом «Малітвы вайны» гурту «Крывакрыж» Сяргей Богдан. Яна была апублікаваная на сайце nn.by.

Ён крытыкуе як мову песень «Крывакрыжа»: «як і раней, коні свішчуць», «крыўляліся шпілямі купалы», «цагліны драпежна плылі сцяной», «парастала агнём крапіўё» — так і агрэсіўны змест альбому.




«Гэты альбом не можа быць зразуметы нікім, — піша рэцэнзент, — а толькі можа быць успрыняты пэўнай экзальтаванай аўдыторыяй, арыентаванай на захапленне ад пэўных словаў-стымулаў. «Песня будзе ўспрымацца нават калі яна будзе складацца з складоў «бу-бу-бу», але паміж «бу» будуць устаўляцца пэўныя словы, што стымулююць эмацыйнае ўзварушэнне рэцыпіентаў — Літва, багі, Крыўя, вайна, Масква, агонь, Смаленск».

Што да зместу, то крывакрыжаўцы апяваюць у сваіх творах экспансіянізм на расійскія абшары. Ёсць нават тэкст «Великая Литва», складзены па-расійску: «Пусть бушует Двина, разъяряется Днепр // И навечно Московия сгинет. // Мы приветствуем вас, о родная нам Тверь, // О Смоленск, братний нам и поныне».

Прыхільнікі «балцкае тэорыі» паходжання беларусаў і паганскіх субкультураў з С.Богданам рэзка палемізуюць.

**МБ**



# Дзеля чаго Сідорскі лётаў у Франкфурт?

**Палітык Павел Севярынец ляцеў адным рэйсам у Германію з прэм'ер-міністрам Сяргеем Сідорскім.**

«Гэта было 8 сакавіка, калі мы разам з Алесем Лагвінцом накіроўваліся ў Страсбург для сустрэчы з еўрадэпутатамі. Яшчэ ў аэрапорце было ажыўленне. Прыгледзеўся — Сідорскі. Ішоў разам з нейкай жанчынай. Ці то дачка, ці то жонка.

У яе руках былі кветкі — вядома ж, 8 Сакавіка. У Германіі яго сустракала істотная дэлегацыя, чалавек пятнаццаць. Мы павіталіся з ім, ён нам таксама адказаў», — кажа П.Севярынец.

«НН» звярнулася да прэс-сакратара прэм'ер-міністра Аляксандра Цімашэнкі з пытаннем, ці гэта быў працоўны візіт, ці прыватны. «Пра гэтую паездку я нічога не ведаю», — адказаў А.Цімашэнка.

На сайце Савету міністраў ніякіх звестак аб працы Сяргея Сідорскага не было ад 8 да 17 сакавіка.

Паводле непацверджанай інфармацыі, дачка С.Сідорскага вучыцца ў Нямеччыне. Удакладніць гэтую інфармацыю нам таксама не ўдалося.

**Зміцер Панкавец**

# Пяткевіч другі раз выйшла замуж

**27 сакавіка першая намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта ўзяла шлюб з намеснікам старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандрам Мартыненкам.**



Цырымонія адбылася ў Мінскім гарадскім доме шлюбаў на вуліцы Камуністычнай без прысутнасці рэпарцёраў.

Мартыненка «праславіўся» як вядоўца «Панарамы». Цяпер ён вядзе ток-шоў «Ход у адказ». Для яго гэта першы шлюб. З яго нагоды ён узяў адпачынак да 30 сакавіка.

Адзначым, што Наталля Пяткевіч (Краўчанка) ужо была замужам. Яе былы муж Уладзіслаў Пяткевіч узначальвае «Нацыянальныя спартыўныя латарэі».

**МБ**

# Гендырэктара «Ждановічаў» раскулачылі

**Распрацоўваецца графік, па якім Яўген Шыгалаў верне «ўсё» ў «досыць кароткі час», паведаміў журналістам 27 сакавіка міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў.**

Я.Шыгалаў павінен пакрыць дзяржаве шкоду ў памеры 85 млрд рублёў. Асноўным эпізодам, што ставіцца ў віну бізнесмену, з'яўляецца нямэтавае выкарыстанне зямель і захоп зямель.

«Зямля была захоплена самавольна, але цяпер так склалася, што там працуе вялікая колькасць людзей. Таму мы ўносім прапанову ўзаконіць гэтыя землі, пакрыць шкоду», — сказаў У.Навумаў.

Адказваючы на пытанне, ці адсочвае МУС паходжанне грошай, якія накіроўваюцца на пакрыццё шкоды, міністр зазначыў: «Ва ўмовах лібералізацыі эканомікі прадугледжваем і тое, што мы ў нейкай меры, калі было ўчынена не цяжкае эканамічнае злачынства і яно не з'яўляецца карупцыйным, не будзем занадта ўнікаць у гэтыя грошы».

Я.Шыгалаў быў затрыманы ў Мінску 5 красавіка 2008 года. Яму было прад'яўлена абвінавачанне ва ўчыненні злачынстваў, прадугледжаных ч. 4 арт. 16 КК (саўдзел у злачынстве) і ч. 3 арт. 424 КК (злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі). 26 чэрвеня ён быў вызвалены з-пад варты пад заставу 10 млрд рублёў.

У ліпені Я.Шыгалаў выязджаў на лячэнне ў Лондан.

**Паводле БелаПАН**

# Прыйшоў настаўнік і забраў куртку

Новыя метады змагання з школьнікамі, якія ездзяць на вулічныя акцыі апазіцыі, прыдумалі ў салігорскай СШ №3. Каб не пусціць Андруся Тычыну ў Мінск на Дзень Волі настаўнікі 24 сакавіка забралі ў яго куртку. Без курткі не ўцячэ.

Пасля заняткаў завуч павяла школьніка ў кавярню. А ўласна 25 Сакавіка ўжо ў палову на восьмую раніцы да Тычыны дадому прыйшлі міліцыянты, якія пад канвоем і завялі хлопца ў школу. Потым цэлы дзень дзяжурылі там, каб не збег.

**ЗП**



Тычына ў часе перформансу супраць гвалтоўнага прызыву ў армію Івана Шылы.

## ЗДАРЭННІ

### Двойчы сеў за руль п'яным — канфіскуюць аўтамабіль

Міністэрства юстыцыі адрасавала дзяржаўным органам на ўзгадненне праект нарматыўнага акту, паводле якога прадугледжваецца канфіскацыя транспартнага сродку за паўторнае на працягу году пасля прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці за кіраванне ў п'яным стане.

### У Батанічным садзе знайшлі труп

29 сакавіка паміж падвойным плотам Цэнтральнага батанічнага саду ў сталіцы знайшлі труп невядомай жанчыны. Прыкметаў гвалтоўнай смерці на целе не было. Труп быў загорнуты ў радно. Прычына смерці і асоба высвятляюцца.

### Пенсіянер выжыў пад грузавіком

Здарэнне адбылося 27 сакавіка на вул.Якуба Коласа. Грузавы мікрааўтобус «Мэрсэдэс-Бэнц 308», даючы назад, наехаў на 75-гадовага пенсіянера. Лямант паднялі людзі, калі пенсіянер ужо ляжаў пад машынай. Пацярпелы заставаўся прытомны і толькі прасіў «падняць машыну». Яго паклалі ў шпіталь. Дужыя ж у Беларусі пенсіянеры!

### Палкоўнік ГРУ прадаваў у рабства

Палкоўнік ГРУ — расійскай вайсковай разведкі — абвінавачваецца ў продажы ў рабства 130 жанчын. Ён кіраваў міжнароднай злачыннай групоўкай. Грамадзянак пяці краінаў, у тым ліку Беларусі, вывозілі ў Ізраіль для прастытуцыі.

### Не вынес пенсіі

Дэкан Віцебскага ўніверсітэту зрабіў сабе смерць. Мікалай Бальшакоў пракіраваў матэматычным факультэтам амаль 35 гадоў. Калі даведаўся, што з дэканамі-пенсіянерамі кантракты не падоўжаць, не вытрываў. Быў ён чалавекам добрым да падначаленых, заўсёды ішоў насустрач і адгукаўся на чужую бяду. Быў ён 1940 году нараджэння.

### Кацельня, у якой загінулі пяцёра, працуе і цяпер

24 сакавіка ў кацельні вёскі Арабаўшчына, што ў Баранавіцкім раёне, знайшлі целы пяці мужчынаў. Яны рамантавалі кацёл і ўчадзелі. Чацвёра з іх былі мясцовымі, адзін — з суседняй вёскі. Кацельня працуе па-ранейшаму.

### У Полацку знік хлопчык

10-гадовы школьнік з Полацку Уладзіслаў Рагоўскі знік у чацвер 19 сакавіка ў другой палове дня. Ён выйшаў з СШ №11, і з таго часу яго ніхто не бачыў. Калі хто што ведае пра хлопчыка, міліцыя просіць званіць:

(017) 218-79-89 — дзяжурная служба МУС;

(0212) 24-88-00 — дзяжурная служба УУС Віцебскага аблвыканкаму;

(0214) 42-32-02 — дзяжурная служба Полацкага ГУУС.

**МБ; паводле БелаПАН, gazeta.pl, радыё «Свабода», РІА Навіны, Інтэкс-прэс, Народныя навіны Віцебска**

# Адрэзалі ад Ломаця

**КДБ і МУС працягваюць ваяваць з Камітэтам дзяржкантролю. Новыя гучныя арышты.**

На мінулым тыдні стала вядома, што Аляксандр Лукашэнка вырашыў працягнуць яшчэ на пяць гадоў знаходжанне на дзяржаўнай службе старшыні КДК Зянона Ломаця.

Адначасова з гэтым МУС і КДБ пачалі рэалізацыю аператыўных мерапрыемстваў у дачыненні да службовых асобаў КДК. У выніку адзін за адным былі затрыманыя спачатку начальнік аддзялення арганізацыі аператыўна-вышуковай дзейнасці УДФР КДК РБ па Мінскай вобласці і г.Мінску, а потым начальнік Пінскага міжрайаддзелу УДФР КДК па Брэсцкай вобласці.

Як вядома, старшыні КДК Зянону Ломацю ўжо споўнілася 65 гадоў, а значыць, ён дасягнуў пенсійнага ўзросту і павінен вызваліць месца больш маладому пераемніку.

Аднак ужо ў лютым у Адміністрацыю прэзідэнта пайшлі дакументы на прызначэнне намеснікам старшыні КДК Віктара Пісарыка, які цяпер займае пасаду дарадцы З.Ломаця. Пасля гэтага ў МУС і КДБ захваляваліся.

Бо В.Пісарык, нягледзячы на тое, што займае ўсяго толькі пасаду дарадцы, па сутнасці з'яўляецца другім чалавекам у КДК.

Можна таксама сказаць — першым. Менавіта ён і вызначае палітыку КДК, падказваючы З.Ломацю асноўныя хады і раскрываючы ўнутраныя змовы. Прызначэнне В.Пісарыка намеснікам старшыні КДК азначала б, што З.Ломаць нікуды не сыдзе. Гэта і пацвердзілася на мінулым тыдні, калі прэзідэнт вырашыў працягнуць тэрмін дзяржслужбы старшыні КДК яшчэ на пяць гадоў. Хаця і В.Пісарык, адносна якога ў мінулым годзе таксама распачыналася крымінальная справа, — асоба, якая сама па сабе выклікае вельмі шмат негатыўных эмоцыяў у МУС і КДБ.

Першы своеасаблівы падарунак З.Ломацю зрабіла МУС, якое правяло вельмі паспяховую аперацыю па выяўленні атрымання хабару чалавекам, які адказвае за аператыўную работу Упраўлення ДФР КДК па Мінскай вобласці і г.Мінску. Прычым рэдкі выпадак: аперацыя была здзейснена так прафесійна, што аператыўнікам Упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Мінаблвыканкаму спярша ўдалося ўзяць пасярэднікаў, а потым праз іх з дапамогай Галоўнага ўпраўлення аператыўна-вышуковай дзейнасці выйсці на атрымальніка хабару.

Як распавялі ў пракуратуры Мінскай вобласці, 19 сакавіка на тэрыторыі спартыўнай базы Федэрацыі прафсаюзаў былі затрыманыя намеснік дырэктара ААТ «Тарыфкрэмбуд», які падбіваў двух бізнэсоўцаў да дачы 10 тыс. даляраў службовым асобам УДФР КДК па Мінскай вобласці і г.Мінску. Пры атрыманні 8 тыс. даляраў пасярэднік быў затрыманы. З ім сталі сур'ёзна працаваць, у выніку чаго атрымалі згоду на ўдзел у далейшых аператыўна-вышуковых мерапрыемствах. А далей ўсё прайшло прыгожа, можна нават сказаць, класічна.

На наступны дзень каля будынку УДФР па Мінскай вобласці і г.Мінску па вул. П.Броўкі пры атрыманні 8 тыс. даляраў быў затрыманы маёр Андрэй Касьянаў, які займае пасаду начальніка арганізацыі АРД у пазначаным упраўленні. Быццам грошы ён атрымаў за здзяйсненне заведама незаконных дзеянняў па рашэнні пытання аб спыненні крымінальнага пераследу адносна двух мінскіх бізнэсоўцаў. Усю аперацыю азмрочыла толькі адно: на момант перадачы грошай матэрыялы адносна бізнэсоўцаў сышлі ў пракуратуру, а значыць, А.Касьянаў ужо не меў магчымасці прымаць па іх рашэнні. Тым не менш пракуратура Мінскай вобласці ўзбудзіла супраць затрыманага крымінальную справу па ч.2 арт.430 КК РБ («Атрыманне хабару ў буйным памеры»).

Гісторыя з арыштам начальніка Пінскага міжрайаддзелу УДФР па Брэсцкай вобласці ахутана таямніцай. Вядома толькі, што па ім аператыўныя мерапрыемствы праводзілі супрацоўнікі КДБ. Нібыта начальніку аддзелу прад'явілі абвінавачанне па адным з самых цяжкіх артыкулаў Крымінальнага кодэксу — 285 («Стварэнне злачыннай арганізацыі альбо ўдзел у ёй»).

Тое, што цяпер адбываецца паміж МУС, КДБ і КД, — гэта барацьба сілавікоў за сферы ўплыву.

**Паводле «Ежедневника»**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Высокія чыноўнікі ходзяць на адны святы, але нярэдка вядуць зацятую барацьбу за ўплывы. На фота (справа налева): былыя кіраўнікі палатаў Уладзімір Канаплёў і Генадзь Навіцкі, старшыня Камітэту дзяржкантролю Зянон Ломаць.**

# Восем гадоў турмы атрымаў былы супрацоўнік міліцыі

**Следчы пракуратуры тройчы прымаў пастанову аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы «праз адсутнасць складу злачынства», але пракурор раёну адмяняў гэтыя пастановы на падставе скаргі маці згвалтаванай дзяўчынкі.**

Суд Гомельскага раёну 24 сакавіка абвясціў прыгавор жыхару адной з вёсак раёну, былому супрацоўніку аддзелу дэпартаменту аховы МУС, звольненаму з органаў унутраных спраў некалькі гадоў таму.

Яго абвінавацілі ва ўчыненні гвалтоўных дзеянняў сексуальнага характару ў дачыненні да чатырохгадовай дзяўчынкі.

Як паведаміў БелаПАН намеснік старшыні суда Гомельскага раёну Арцём Камалыеў, мужчына 1969 года нараджэння прыгавораны да васьмі гадоў пазбаўлення волі з адбыццём пакарання ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Яму інкрымінавалася злачынства, прадугледжанае часткай 3 артыкула 167 КК (дзеянні сексуальнага характару, учыненыя ў дачыненні да заведама малалетняй). Бацькам дзяўчынкі ён павінен выплаціць адшкадаванне 2 млн рублёў.

З прысудам абвінавачаны не згодны і мае намер яго абскардзіць.

Паводле матэрыялаў справы, гвалт быў учынены ў ліпені 2008 года, калі дзяўчынка прайшла ў госці да суседскага хлопчыка, з якім наведвала адну групу дзіцячага садка.

Бацька хлопчыка і ўчыніў гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару. На судзе ён растлумачыў гэты тым, што быў у стане моцнага алкагольнага ап'янення. Потым дзіця расказала аб здарэнні бабулі. Маці дзяўчынкі звярнулася ў міліцыю, справа была перададзена ў пракуратуру Гомельскага раёну.

Следчы пракуратуры тройчы прымаў пастанову аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы «праз адсутнасць складу злачынства», але пракурор раёну адмяняў гэтыя пастановы на падставе скаргі маці дзяўчынкі.

Паводле слоў А.Камалыева, гэта не адзінкавы выпадак гвалту ў дачыненні да дзяцей у рэгіёне.

Так, у 2008 годзе 27-гадовы жыхар Гомельскага раёна быў прыгавораны да 12 гадоў пазбаўлення волі на падставе аналагічнага артыкулу КК. Яго ахвярай стала 12-гадовая дзяўчынка. У злачынцы падчас экспертызы выявіліся псіхічныя адхіленні і хранічны алкагалізм. Прысуд набыў моц.

У суд Лельчыцкага раёну перададзена справа ў дачыненні да яшчэ аднаго былога супрацоўніка дэпартамента аховы МУС, якога абвінавачваюць ва ўчыненні двух згвалтаванняў, у тым ліку 15-гадовай школьніцы. Мяркуецца, што разгляд справы ў судзе пачнецца ў красавіку.

**Алена Германовіч, БелаПАН**

## Ідэалагічная каламуць

**Дачка ходзіць у першы клас, які месціцца ў садку. Забіраю яе і ўглядаюся ў «Парады для бацькоў» на дошцы.**

На дошцы вісіць сённяшняе меню. Цікава. Але што я бачу побач? Патрыятычнае выхаванне! Прышчапляйце дзіцяці павагу да нашай дзяржавы, яе сімвалаў. Святкуйце дзяржаўныя святы — Дзень канстытуцыі, Дзень перамогі, Першамай, 7 лістапада. Расказвайце дзеткам пра герояў Вялікай айчыннай і Грамадзянскай войнаў.

Вось такая дзяржаўная ідэалогія. Нехта з выхавацеляў зняў са старога савецкага падручніка тэкст, нават не паспрабаваўшы нешта змяніць. Бо нават не дадалі пра адмыслова незалежна-беларускае свята — 3 ліпеня.

Жахліва робіцца за нашых настаўнікаў — тыя дасюль жывуць у СССР і вучаць так «жыць» нашых дзетак.

**Іван Кавяра, Баранавічы**

## Дзе памяць пра ахвяры?

**Да вайны ў Мінску жыла каля 250 000 насельніцтва. У вызваленым Мінску засталося 37 000. У эвакуацыю з'ехала недзе 5%. Куды дзеліся астатнія насельнікі?**

Я нарадзіўся ў 1931 годзе. Наша сям'я ў Мінску жыве з 1935 году. Пражылі ўсю акупацыю ў Мінску на вуліцы Цнянскай. Я ўжо быў падлетак, добра памятаю тыя часы.

У Мінску захопнікі ўстанавілі такія правілы — за нямецкага забітага салдата забівалі 10 жыхароў, за афіцэра — 100 жыхароў. Калі забілі гаўляйтэра Кубэ, у Мінску расстралялі больш за чатыры тысячы насельніцтва. Ачапілі тры вуліцы і знішчылі. Дык вось, дзе ёсць памяць аб гэтых ахвярах? Ніводнага помніка і слова пра гэта. Так, ёсць помнікі героям вайны, аб гэтым пішацца. Пішацца аб ахвярах гета. Да вайны Мінск меў 45% насельніцтва габрэяў. У Мінску загінула каля 200 000. Палова — габрэі ў гета, палова — астатнія такія ж насельнікі Мінску: старыя, дзеці, жанчыны. Дзе памяць аб гэтым? Я звяртаўся з гэтым пытаннем у афіцыйныя газеты, на тэлебачанне. Маўчаць. Чаму маўчаць? Проста дзіўна. У гэтым годзе 65 гадоў вызвалення Беларусі.

Пара пра гэтыя ахвяры і сказаць.

**Анатоль Налівaeў, Мінск**

## Дзівацкія паводзіны Аляксандра Лукашэнкі

**Чытаю: «Аляксандр Лукашэнка павіншаваў міністра замежных справаў Расіі Сяргея Лаўрова з Днём нараджэння».** З якой нагоды кіраўнік нібыта незалежнае дзяржавы віншуе міністра суседняга гаспадарства? Што, ён і Сікорскага віншуе, і Ушацкаса, і Клінтаніху? Ці Мядзведзеў віншуе нашага Мартынава? Гэтыя «некванвенцыйныя жэсты» выглядаюць як лебязенне перад патронам. Думаю, ад іх больш псіхалагічнай шкоды для нашых чыноўнікаў, чым карысці ў выглядзе асаблівага стаўлення з боку Расіі.

**Сяргей, tut.by**

## Футбольная адысея

**Да пачатку футбольнага сезону ў Беларусі.**

Мяч на цэнтры. Судзейскі свісток.
І гульня, як віхор, дух займае.
Вось мне пас, і з мячом першы крок,
І трыбуны інтрыга трымае.

Я каметай імчуся ў штрафную,
Мо хутчэй, чым любая з камет,
За плячыма — выразна чую —
Абаронца мне дыхае ўслед.

Вось той момант, той міг не бясконцы,
Я зраблю падарунак сябрам!..
І фінтом збіў запал абаронцы,
Рух управа, далей — сам-насам.

Удар мой чакаюць трыбуны,
Я чую іх гоман шалёны.
Усё ў руках фартуны:
І подых салодкі, і пошум салёны.

Але што гэта? Мяч губляю,
Абаронца паспеў у падкаце…
Хоць не першы я матч гуляю,
Але мяч недарэчна страціў.

Стадыён выбухае крыкам,
Увесь у роспачы, аж кіпіць,
На табло бачу лічбы з лікам,
Які я не здолеў змяніць.

Моўчкі вочы закрыў рукамі,
Жаль і боль за сябе, за сяброў.
Я давер падфутболіў нагамі
І балельшчыцкую любоў.

**Юрась Бабіч**

## Nie razumieć pa-rasiejsku

**«Zakon pra movy» dazvalaje mnie, hramadzianinu dziaržavy, nia viedać druhoj dziaržaunaj movy.** Uzbrojeny takimi viedami, zachodžu ŭ bank. Adrazu ž z parohu: «Ja — biełarus. Vy možacie razmaŭlać sa mnoj pa-biełarusku, bo rasiejskaj ja nia viedaju i na toje maju prava». Mnie treba zrabić plastykavuju kartku ŭ dadzienym filijale «Biełarusbanku». Dziela hetaha ŭsie dakumenty, jakija ja mušu pračytać i padpisać, pavinny być na toj movie, na jakoj chaču ja, klijent. Načalnica addziełu zapiarečyła była: «Я тоже могу заявить, что не знаю белорусского...» «Nie, nie, nie, — pierabiŭ ja jaje. — Takoje vy možacie zajaŭlać tolki ŭ addziele kadraŭ. Tam vas paprostu nia prymuć na pracu. Bo nichto ž nie zachoča parušać 4-ty artykuł Zakonu. Dziaržaŭnyja rabotniki abaviazanyja vałodać i pieršaj, i druhoj dziaržaŭnymi movami». U vyniku mnie ŭ ruki lahli Damova i Ankieta, na čyściutkaj narkamaŭcy. A ŭ navahodni viečar ja atrymaŭ kartku i kapertu z pin-kodam. Ale jany byli užo pa-rasiejsku. Naviedaŭ ja halaŭny «Biełarusbank». Zaviaršyłasia tym, što bank zrabiu mnie piersanalna pierakład kartki i kaperty.

Ja chaču, kab spraŭdziŭsia Kupałaŭ zapaviet, i biełaruskaja mova zapanavała, h. zn. pamianiałasia miejscami z rasiejskaj. A siońniašni stan mianie, biełarusa, abražaje. Ja nie chaču «razumieć» taki stan. Ja zaklikaju biełarusaŭ nie razumieć rasiejskaje movy. Zakon heta nam dazvalaje.

**Henik Łojka, Miensk**

**Ад Рэдакцыі.** Агітаваць за беларускую мову варта ўласным прыкладам — прыгожага маўлення, дастойных паводзінаў, прывабнага ладу жыцця. Вы ж сваім учынкам толькі прымножылі фобіі і комплексы, насаджаныя ў час каланіялізму. Гэта не тая зацятасць, якая выкліча павагу.

## МОЎНЫЯ ДРАБНІЦЫ

### НА Беларусі ці У Беларусі?

У адной дзяржаўнай нацыянальнай газеце ёсць загаловак: «На Беларусі таннеюць аўтамабілі».

НА Беларусі ці У Беларусі?

Беларусь — гэта па-ранейшаму тэрыторыя, край ці ўжо дзяржава, краіна? Калі дзяржава і краіна, то У Беларусі. І ВА Украіне. Дарэчы, старыя беларускія аўтары пазбягалі гэтага НА і пісалі ня толькі «У Беларусі», але і «У Палессі», «У паўночнай Смаленшчыне», «У цэнтральнай Смаленшчыне, паўночнай палавіне Магілеўшчыны, Віленшчыне і паўночна-заходняй Горадзеншчыне» (гл. «Географію Беларусі» Аркадзя Смоліча).

### Танчэй і танчэйшы

У другім нумары кінуўся ў вочы загаловак «Чым танчэй лёд, тым больш на яго хочацца?». Тут тыповая калька з расейскае. У расейскай мове форма «тоньше» ўтвараецца і ад прыслоўя «тонко», і ад прыметніка «тонкий»: Маша раскатала тесто тонко, а Дуняша — тоньше; у Маши тонкая нитка, а у Дуняши — тоньше. У беларускай мове гэткага збегу практычна няма: Маня раскатала цеста тонка, а Дуня — танчэй;

у Мані нітка тонкая, а Дуні – танчэйшая.

Адпаведна ў загалоўку звяздоўскай карэспандэнцыі павінна было б стаяць: Чым танчэйшы лёд, тым больш на яго хочацца?»

**Анатоль Сідарэвіч**

## ВОДГУК

### Найперш стаць еўрапейцамі («Рэкультывацыя меліяраванай свядомасці», «НН» № 9'2009)

**Не чакаў, што «Наша Ніва» можа надрукаваць такі артыкул.** У ім найболыш яскрава адлюстравана тое, аб чым самому хацелася выказацца. Не аднойчы задаваў пытанні этнічнай украінскасці нашага рэгіёну, палітычным лідэрам (З.Пазняку, П.Севярынцу), але не чуў зразумелага адказу. Як быццам не існуе ад Пінску да Брэсту мільёна жыхароў нашай краіны, якія размаўляюць на побытавым узроўні далёка не на дыялекце беларускай ці расійскай мовы.

Я жыву амаль на мяжы этнічнага падзелу. Ёсць шмат гістарычных мапаў гэтага падзелу. Але найбольш пэўна адлюстроўваюць сітуацыю этнаграфічныя мапы Карскага.

А зараз, ці мае гэтая тэма падставы? У пачатковых класах, калі з мяне рабілі «homo soveticus», я абражаў сваю прабабульку, якая размаўляла на вельмі старой нейкай мове (ужывала шмат несучасных словаў). Пазней, наведаўшы Нямеччыну, заўважыў, што шмат якія нямецкія словы маюць адны карані з тымі словамі, што ўжывала мая прабабулька. Пасля я абтрос з сябе саветыкуса.

Аднойчы пры канцы 1960-х, вярнуўшыся са школы, уключыў тэлевізар. Там паказвалі такі сюжэт: у далёкай эстонскай вёсцы заставалася каля дзесятка жыхароў. Вёска вымірала. Мова ў гэтай вёсцы значна адрознівалася ад мовы навакольных. Сюды прыехаў этнограф, каб вывучыць гэтую мову. Ягонае меркаванне такое: сусветная культура нешта страціць, калі памрэ апошні жыхар. Гэта мяне вельмі ўразіла.

Навучаючыся ў школе, шмат разоў было, што калі на перапынках паміж урокамі некаторыя настаўнікі заўважалі, што мы размаўляем на сваёй мове, доўга потым зневажалі нас:

— Нужно разговаривать на русском или белорусском языке, а не на...

Вольна ці нявольна, але нам убівалася наша непаўнавартасць. Гэта потым адлюстроўвалася на нашых адзнаках...

Да нядаўна я разам з сынам часта ездзіў у наш пасёлак да маёй маці. Ён нядрэнна размаўляў на нашай мове. (Гэта было карысна і таму, што потым, калі вучыўся ў Чэхіі, яму было значна прасцей перайсці з украінскай на чэшскую). На нашай вуліцы пражывала сям'я перасяленцаў з вёскі Маладзельчыцы. Бацькі ў той сям'і размаўлялі на нашай мове. Іхні сын, размаўляў толькі па-расійску. Калі яго бацькі чулі, што той пачынаў ужываць пры размове з маім сынам мясцовыя словы, то білі яго па вуснах, адпраўлялі дамоў і некалькі дзён не дазвалялі сустракацца з маім сынам. Яны самі былі не здольныя размаўляць па-расійску, але лічылі, што дачка і сын павінны размаўляць толькі па-расійску.

Летась, праз 38 гадоў пасля заканчэння школы, мы, аднакласнікі, сабраліся. Не кожны можа ўявіць, як гэта прыемна, калі значная колькасць з нас перайшла на родную мову. Мы зноў пачулі дух адносінаў нашага класу.

На працягу двух гадоў я ездзіў ва Украіну. Спрабаваў размаўляць па-ўкраінску. Мяне адразу вылічвалі, што я — не ўкраінец. Але з цягам часу заўважыў, што ва ўкраінцаў, як і ў шмат якіх народаў, ёсць свае дыялекты. Тады пачаў размаўляць па-свойму. Здзіўленню не было канца. Усе ва Украіне перасталі верыць, што я з Беларусі.

— Звідки ты нашу мову так добрэ знаеш? — пытаюцца.

— Я так з маткой розмовляю!

— Нэ можэ буты, тут шось нэ тэ, підманюеш! — супярэчылі ў асноўным мне.

Па маці я з Малашцыцкіх, а гэта — з роду Радзівілаў. Бацька мой з Гродзеншчыны, з Дзятлаўскага раёну. Па прозвішчы, як быццам, паляк. Няма сэнсу абвінавачваць мяне ў жаданні адарваць Брэстчыну ад Беларусі.

Лічу, што мы павінны стаць у першую чаргу еўрапейцамі, а толькі потым — беларусамі, габрэямі, палякамі, украінцамі, расійцамі і так далей. Пакуль не перастанем цягнуць кожны коўдру на сябе, цывілізавана не вырашым нашы суадносіны, то патонем у багне задворкаў Расійскай імперыі, у якой рукі даўжэйшыя, чым мы ўяўляем.

**Костусь Чувак, Пінск**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу.
Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

Збяры Кнігарню «Наша Ніва»



















ПЫТАЙЦЕСЯ Ў КНІГАРНЯХ І Ў НЕЗАЛЕЖНЫХ РАСПАЎСЮДНІКАЎ



Бітва на Нямізе. Мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу. Менавіта летапісамі натхняўся аўтар «Слова».



Чэшскі славіст і езуіт Ёсіф Добраўскі — адзін з магчымых аўтараў «Слова».

# «Слова пра паход Ігаравы» напісаў езуіт?

**Даследчыкі даказваюць, што хрэстаматыйны твор — фальсіфікацыя, створаная ў канцы XVIII стагоддзя.**

«Слова пра паход Ігаравы» лічыцца вяршыняй сярэднявечнай рускай літаратуры і яе самым вядомым помнікам. З моманту выяўлення «Слова» ў пачатку XIX ст. зроблена мноства яго перакладаў і тлумачэнняў, ствараліся навуковыя працы, і цэлыя навуковыя кар’еры будаваліся на яго вывучэнні. «Слова» натхняла найлепшых паэтаў усходнеславянскіх народаў. Традыцыя беларускіх перакладаў «Слова» вядзецца ад Багдановіча і Купалы да Барадуліна і Чыгрынава.

У «Слове» былі закладзеныя многія вобразы і метафары, з дапамогай якіх мы сёння ўяўляем XI—XII стагоддзі. Менавіта ў «Слове» князь-чараўнік Усяслаў Полацкі «скочыў ваўком да Нямігі з Дудутак». Яму «ў Полацку ютрань пазванілі рана ў званы ў Святое Сафіі, а ён той звон у Кіеве чуе». А на самой Нямізе

**«...снапы сцелюць галовамі,**
**малоцяць цапамі харалужнымі,**
**жыццё кладуць на таку,**
**веюць душу ад цела.**
**Нямігі крывавыя берагі**
**не дабром былі засеяны —**
**засеяны касцямі рускіх сыноў».**

(Пераклад–пералажэнне Віктара Дарашкевіча)

## Першыя сумневы

Але гісторыя адкрыцця рукапісу досыць цьмяная. Зборнік з тэкстам слова, паводле яго адкрывальніка, аднаго з найпаспяховейшых калекцыянераў сваёй эпохі графа Аляксея Мусіна-Пушкіна, быў выяўлены ў былым Спаса-Праабражэнскім манастыры Яраслаўля. Першае выданне з’явілася ў 1800 г. без усялякага ўказання на імёны асобаў, якія працавалі над прачытаннем і выданнем твору. Апроч таго, існуе рукапісная копія, знятая нібы для расійскай царыцы Кацярыны II. І гэта ўсё! Спачатку казалі, што рукапіс знік ці то ў 1815, ці то ў 1795 г. Пасля не спыніліся на афіцыйнай версіі, што «паэма» загінула ў маскоўскім пажары 1812 г. Гучыць досыць праўдападобна.

Адразу пасля публікацыі пачуліся галасы сумневу што да аўтэнтычнасці «Слова». Скептыкі ківалі на «Задоншчыну» — рэальны помнік літаратуры к.XIV—XV ст., у якім апавядаецца пра Кулікоўскую бітву 1380 г. «Задоншчына» захавалася ў шасці спісах (копіях) XV ст. Пасля публікацыі ў 1852 г., яна была ўспрынятая як наследаванне «Слову» — асобныя яе выразы, вобразы, цэлыя фразы паўтаралі і перапрацоўвалі адпаведныя вобразы, пасажы і выразы «Слова». Але і французскі славіст Луі Лежэ ў канцы XIX ст., і даследчык Андрэ Мазон у 1920—1950-я, параўноўваючы тэксты «Задоншчыны» і «Слова», рабілі аднолькавыя высновы: менавіта «Слова» было створанае ў канцы XVIII ст. паводле ўзору «Задоншчыны», а не наадварот. Таксама Мазон назваў і імя аднаго з меркаваных аўтараў «Слова» —архімандрыта Іяіля Быкоўскага, царкоўнага дзеяча і пісьменніка, які паходзіў з Беларусі. Вось чаму ў тэксце паэмы столькі беларускіх сюжэтаў! Менавіта ў яго Мусін-Пушкін набыў рукапісны зборнік, у якім утрымліваўся тэкст «Слова». Гэтай версіі трымаўся і слынны савецкі гісторык другой паловы XX ст. Аляксандр Зімін.

## «Сіяністкі заказ»

Аляксандр Зімін быў вядомы як



Расійскі гісторык Аляксандр Зімін за свае погляды рызыкаваў прафесіяй.

даследчык сацыяльнай і палітычнай гісторыі Расіі XV—XVII стст. Гэта досыць рэдкі выпадак у Савецкім Саюзе, калі гісторык здолеў стаць доктарам навук, не быўшы членам КПСС. Зімін не толькі прыняў погляды французскіх славістаў адносна «Слова», але ўзмацніў іх аргументацыю, давёўшы, што «Слова» не проста падобна на «Задоншчыну», яно падобнае на самы позні яе варыянт. Паводле Зіміна, крыніцамі «Слова» былі летапісы, а таксама фальклор, у тым ліку і беларускі.

А.Зімін ніколі не быў у навуцы дысідэнтам, меў «стэрыльную» анкету, а ягоныя працы заўжды вылучаліся стрыманасцю і аргументаванасцю. Але тут гісторык фактычна паставіў пад сумнеў адну з найважнейшых крыніц, на якой будавалася канцэпцыя старажытнарускай народнасці, «адзінства ўсходнеславянскіх народаў». На Зіміна абрынуліся гранды расійскай гуманітарнай навукі — Дзмітрый Ліхачоў і Барыс Рыбакоў.

На зыходзе хрушчоўскай «адлігі» яшчэ магчыма было патрабаваць акадэмічнай дыскусіі. Зімін хацеў апублікаваць кнігу. Яму ж дазволілі зрабіць на ратапрынце 101 асобнік, якія, з умовамі вяртання, былі раздадзеныя запрошаным на дыскусію аб «Слове» навукоўцам. 4—6 мая 1964 г. у зале Аддзялення гісторыі АН СССР адбылося абмеркаванне, якое звялося да дыскрэдытацыі аўтара. Дз.Ліхачоў, які шчыра верыў у старажытнасць літаратурнага помніка і прысвяціў яму шэраг сваіх прац, усё ж прапаноўваў апублікаваць кнігу Зіміна. Б.Рыбакоў, вядомы сваім шавінізмам і антысемітызмам, настойваў, што гэтае даследаванне — «сіяністкі заказ». Пасля той дыскусіі аўтару скандальнага рукапісу прыйшлося сысці з Інстытуту гісторыі АН СССР.

Да канца сваіх дзён у 1980 г. Аляксандр Зімін працягваў удакладняць і дапаўняць тэкст кнігі, якая ў поўным выглядзе выйшла з друку толькі ў 2006 г.

## Чэшскі след

Спрэчкі вакол «Слова» не спыніліся і ў наш час. Найноўшая версія належыць амерыканскаму славісту Эдварду Кінану. У 2003 г. ён апублікаваў аб’ёмістую працу, у якой падсумаваў асноўныя прэтэнзіі скептыкаў:

1. Няма ніводнага дакументальнага пацверджання існавання арыгіналу рукапісу «Слова».

2. На падставе аналізу ліставання непасрэдных удзельнікаў «адкрыцця «Слова» можна сцвярджаць, што ніякі рукапіс у 1812 г. не быў страчаны. Самі ўдзельнікі гісторыі называлі розныя даты, а версія пра 1812 г. замацавалася пасля смерці Мусіна-Пушкіна ў 1817 г.

3. Наяўнасць у тэксце «Слова» вучоных гебраізмаў са Старога Запавету («урым», «орцьма») дае падставу сцвярджаць, што сам твор мог з’явіцца толькі пасля 1524—1525 г., калі ў Венецыі быў надрукаваны старажытна гебрайскі тэкст Біблії.

4. Тэкст «Слова» стракаціць (паводле Кінана) багемізмамі (словамі з чэшскай мовы), каламбурамі і класіцызмамі, што дазваляе сцвярджаць — аўтар паэмы быў добра абазнаны ў славянскіх мовах і літаратурах.

Эдвард Кінан называе і сваю кандыдатуру ў аўтары «Слова» — такім мог быць знакаміты чэшскі славіст і асветнік, езуіт Ёсіф Добраўскі (1753—1829). Менавіта ён, паводле Кінана, валодаў моўнай і навуковай кампетэнцыяй, дастатковай для стварэння падобнага тэксту.

Большасць чэхаў XVIII—XIX стст., а ў іх ліку і Добраўскі, у сваім супрацьстаянні германізацыі былі славянафіламі, аматарамі славянскай мінуўшчыны. Некаторыя ўскладалі спадзяванні на Расію, як на фактар культурнага і палітычнага славянскага ўплыву ў Еўропе. Толькі падзеі XX ст. прымусяць чэхаў адысці ад спадзяванняў на добрую волю Расіі, але гэта ўжо іншая гісторыя. Хоць у самога Добраўскага стаўленне да Расіі было неадназначнае — ён лічыў расіянаў людзьмі мужнымі, але прасцецкімі.

Непасрэдна з рускімі летапісамі Добраўскі мог пазнаёміцца падчас сваёй навуковай выправы ў Санкт-Пецярбург, што стала, як мяркуе Кінан, добрай падставай для ягоных літаратурных практыкаванняў.

Напісаўшы «Слова», Добраўскі не зрабіў ніякага злачынства, мяркуе Кінан. Проста дазволіў сабе некалькі бяскрыўдных пасажаў, імітуючы прачытаную «Задоншчыну» і наследуючы стыль іншых гераічных раннеславянскіх аповесцей. Іншая справа, што яго твор, дбаннямі пазнейшых даследчыкаў, ператварыўся ў базавы тэкст, «неацэнную рэліквію». І ўвогуле, у часы Добраўскага, калі ішлося пра тое, каб «абудзіць дух нацыі і мінулых стагоддзяў», падробкі, імітацыі, несапраўдныя «адкрыцці» ўсялякіх старажытнасцяў былі звычайнай з’явай для ўсіх, «апроч жменькі буркатлівых навукоўцаў».

Дадамо немалаважную дэталь — менавіта вучні Добраўскага, Вацлаў Ганка і Ёсіф Ліндэ, стварылі падобныя чэшскія містыфікацыі — Кралядворскі і Зеленагорскі рукапісы. Пафас гэтых тэкстаў быў той жа, што і ў «Слове» — абуджэнне нацыянальнага гонару чэхаў, адкрыццё забытых старонак гісторыі. На эпічных старонках Кралядворскага рукапісу чэшскія героі перамагаюць саксаў і ратуюць Еўропу ад татараў.

Ёсць і яшчэ адна акалічнасць, на якую звяртае ўвагу даследчык. Многія фрагменты «Слова» можна патлумачыць, калі памятаць, што Добраўскі пакутаваў ад псіхічнай хваробы — найхутчэй, шызаідальнага падваення асобы ці маніякальна-дэпрэсіўнага псіхозу. І «Слова», мяркуе Кінан, было напісана ў перыяд, на які прыпала адно з найбольшых абвастрэнняў (1793—1800). Добраўскі ў найцяжэйшыя дні мог без памылак пісаць тэксты лацінай і нямецкай мовай, але рамкі рэальнасці распадаліся, сучаснасць накладалася на мінуўшчыну, прачытанае ў летапісах — на ўласнаруч напісанае раней... Зыходзячы з гэтага, на думку Кінана, можна патлумачыць згадку ў «Слове» пра Яраслава Асмамысла Галіцкага, які «суды радзіў да Дуная». Гісторыкі пэўныя, што той князь ніяк не мог кантраляваць гарады на Дунаі. Дый Ігар сваіх вояў вадзіў зусім у іншы бок. Затое для жыхара Аўстра-Венгерскай імперыі Дунай, ясная справа, будзе ключавым пунктам. І ён не раз згадваецца ў «Слове».

А нават і славуты заклік да еднасці славянаў — ключавое пасланне «Слова» — мог сфармулявацца пад уплывам перажыванняў аўтара, выкліканых падзеламі Рэчы Паспалітай. Бо, як сведчылі сучаснікі, Добраўскі моцна пераймаўся тым, што славяне-расійцы дапамагаюць Прусіі і Аўстрыі знішчаць славянскую ж Рэч Паспалітую.

Мы не можам катэгарычна сцвярджаць, што «Слова пра паход Ігаравы» было створана багемскім філолагам на падставе актуальных праблем і ведаў 1790-х — гэта толькі гіпотэза. Але падставаў верыць версіі, што геніяльны твор быў напісаны невядомым чарнігаўскім «бардам», застаецца ўсё менш.

У аснове сюжэту «Слова пра паход Ігаравы» — няўдалая выправа рускіх князёў у 1185 г. супраць полаўцаў. Даследчыкі датуюць «Слова» канцом XII ст. — у блізкім часе, пасля падзей, што апісваюцца ў творы, а часам нават тым жа 1185 годам.

На чале выправы стаяў Ноўгарад–Северскі князь Ігар Святаслававіч. Прасякнутая матывамі славянскай народнай паэзіі і паганскай міфалогіі, паводле сваіх мастацкіх вобразаў «Слова» рэзка вылучаецца на фоне лаканічнай і апісальнай старажытнарускай літаратуры. Усе два стагоддзі, як тэкст «Слова» стаў вядомы, твор успрымаўся як заклік да еднасці Рускай зямлі ў яе супрацьстаянні замежнай пагрозе. Заканчваецца твор услаўленнем князёў і іх воінаў, якія «бароняць хрысціян ад паганай чужыны».

# Мяжа Ўсходу і Захаду

**Гомельска–берасцейскае памежжа — гэта адзін з самых нязведаных і фантастычных акрайцаў Беларусі: наколькі розныя з'явы суіснуюць тут. Піша Сяргей Харэўскі.**



З галавакружнае вышыні гранітных скалаў у Глушкавічах можна сузіраць Украіну.

Мяжа Гомельшчыны і Брэстчыны — адзін з самых маланаселеных раёнаў Беларусі. І рэдка адведваных: мала які турыст забрыдае ў гэтыя глухія закуткі. Асабліва пасля Чарнобылю. Між тым радыяцыйнае забруджанне насамрэч мала кранула гэты пас.

Скалістыя гранітныя кар'еры глыбінёю да 30—35 метраў, азёры ў барах і «панскае мінулае», памяць пра якое нясуць тамтэйшыя жыхары — усё гэта ёсць на мяжы Жыткавіцкага і Лельчыцкага раёнаў.

## Ленін з часоў Жыгімонта

Скрозь сцёрты ўшчэнт асфальт дарогі ззяе ружовы гранітны жвір. Таго мікашэвіцкага жвіру тут — аж рабаціць у вачах. Дарога вядзе ў дзікія мясціны. Скрозь вербалоз і алешнік відаць даўно не засяваныя, парослыя куп'ём палі. Усе ленінскія ваколіцы належаць паляўнічаму заказніку. Цераз дарогу скачуць казулі. Спынішся ля рэчкі перакусіць, пабачыш янота і андатраў.

Мястэчка Ленін месціцца сярод сасновых бароў на правым беразе Случы, за кіламетраў пятнаццаць ад Мікашэвічаў. Назва мястэчка, як ні дзіўна, не звязаная з правадыром пралетарыяту! Упершыню Ленін згадваецца ў прывілеі Жыгімонта Аўгуста князю Алелькавічу яшчэ ад 1568 г. Князеў бацька, таксама Юры, Алелькавіч Слуцкі, удзельнік Аршанскае бітвы 1514 году, быў жанаты з Аленай, народжанай Радзівіл. Мо ў яе гонар стары пан Алелькавіч назваў тую сядзібу.

У 1920-я, калі Ленін быў пад Польшчай, палякі пераназвалі мястэчка на самым краі Крэсаў у Саснковічы, у гонар генерала Саснкоўскага. Па 1939-м, вядома, зноў вярнулася назва Ленін.

## Унікальныя габрэйскія могілкі — драўляныя

У часе вайны нацысты знішчылі ў Леніне больш як 2000 габрэяў. Мемарыял ахвярам Халакосту можна пабачыць пры ўваходзе на старажытныя юдэйскія могілкі. Яны унікальныя і самі сабой. Старыя надмагіллі там — драўляныя. Сотні помнікаў, выразаных з тоўстага дрэва. Гэткіх драўляных габрэйскіх надмагілляў, густа спярэшчаных тэкстамі і разьбою, няма больш нідзе ў Беларусі. Так і шапоча тут дзіўны гай на краі Леніна.

На старых праваслаўных могілках, у сасновым бары, ацалеў цікавы помнік драўлянае архітэктуры: капліца ў гонар скасавання прыгону ў 1861 г. Будынак спарахнеў амаль дашчэнту за паўтара стагоддзі, але яшчэ стаіць. Аднавіць драўляную святыню, дзе паўсотні гадоў было запусценне, цяпер малавераемна. То паспейце яе пабачыць! Відовішча вусцішнае, але і чыстае. Бор, магілы без лішніх агароджаў, і старая заімшэлая капліца. Дарэчы, у Жыткавічах на яе ўзор пабудавалі сапраўдную царкву. З залатымі купаламі.

**Гранітныя скалы, гранітныя кар'еры глыбінёю да 35 метраў, азёры сярод бяскрайніх бароў і «панскае мінулае» — усё гэта ёсць у Жыткавіцкім і Лельчыцкім раёнах.**

Як і ў іншых мясцінах Заходняй Беларусі, у Леніне любяць пафанабэрыцца «панскім» мінулым. Ясна, што тут і сала таўсцейшае, і бабы не п'юць, і мужыкі працавітыя, і, наагул народ культурнейшы. Дарма што Гомельшчына, але ж «заходнікі»!

Жыве тут і свой дзівак — Уладзімір Баярын, які ўсё жыццё прысвяціў пошуку доказаў таго, што Уладзімір Ілліч Ульянаў узяў сабе псеўданім менавіта ад назвы мястэчка. Маўляў, мясцовыя габрэі перадалі шчодрае ахвяраванне на сацыял-дэмакратычную справу і ў гонар таго, маўляў, Ульянаў узяў сабе псеўданім: Ленін. Сп.Баярын са школьнікамі перавёз сюды помнік Леніну, арганізаваў Леніскую народную бібліятэку-музей. Незвычайныя перажыткі савецкага часу.




**Гэта адзіны Ленін не ў гонар Леніна**

Ленін упершыню згадваецца ў прывілеі Жыгімонта Аўгуста князю Алелькавічу яшчэ ў 1568. Князеў бацька, таксама Юры, Алелькавіч Слуцкі, удзельнік Аршанскае бітвы 1514 году, быў жанаты з Аленай, народжанай Радзівіл. Мо ў яе гонар стары пан Алелькавіч назваў тую сядзібу.

## Вёскі нашчадкаў уцекачоў

Масты праз Случ, паказаныя на картах, аказаліся небяспечнымі збудаваннямі з рознапамернага бярвення і ў некалькі слаёў набітых дошак-гарбылёў. Па дрыготкай канструкцыі, між купаў вербалозу перабрацца можна на ўсходні бок, дзе ўжо няма і дарогі. Дакладней, паказаная на схемах дарога выяўляецца раскілзанай трактарамі каляінаю ў багністай глебе.

Затое тамака ж, на ўсходнім беразе Случы аказалася не паказаная на мапах вёска Новы Ленін! А крыху ніжэй па плыні і Новыя Місевічы. Гэтыя вёскі збудавалі ў 1930-я ўцекачы з панскай Польшчы. І дасёння ў Новым Леніне паўтараюць страшылкі пра кляты белапольскі прыгнёт. Наагул люд тут негаваркі, суровы. Як і тутэйшы краявід — уздоўж Случы старыцы, балаціны, хмызы...

Але неўзабаве краявід змяняецца, святлее ў вачах. Дарогі лепшаюць. Сярод старога бору блішчаць азёры — адно, яшчэ адно...

Апроч вялізарнага славутага Жыд-возера (цяпер Чырвонае), што дало назву і мястэчку-райцэнтру, тут вакол яшчэ з тузін азёраў. Сярод іх і возера Белае, глыбейшае за іншыя азёры Палесся. Яно сягае больш як 6 метраў глыбіні, а ўшыркі — пару кіламетраў. Гэта выдатна адчуваецца сярод самага летняга сквару, калі з возера вее прахалодны брыз. Паветра чысцюткае. Ужо дзеля яго сюды варта ехаць .

Разам параю меншых азёраў, прытокамі, вытокамі, Даманавіцкім і Рэпішчанскім каналамі, тут — цэлы мікракосмас. Працуюць рыбгасы, здабываюць сапрапелі, абслугоўваюць каналы і шлюзы. На выспе, між каналаў, як Венецыя, прымасціліся вёскі Баравая, мяс-



Сівы Тураў. Буслянка на выканкаме.



Унікальная драўляная капліца ў Леніне, пастаўленая ў гонар адмены прыгону.

### Ленінскі Захад

Мала хто ведае, што захад цяперашняга Лельчыцкага раёну да 1939 году не ўваходзіў у СССР. У 1921-м правабярэжжа Случы адышло да Польшчы з усімі наступствамі: гэта было самае што ні ёсць памежжа, з партызаншчынай, дывэрсантамі і перабежчыкамі, памежнікамі і кантрабандыстамі. Толькі ў 1939 г. з'явіўся Ленінскі раён Пінскае вобласці, з цэнтрам у Мікашэвічах, дзе цяпер здабываюць беларускі граніт.

Канчатковае размежаванне Брэсцкай і Гомельскай абласцей адбылося толькі ў 1960-я. Акурат тады былі ліквідаваныя Тураўскі і Ленінскі раёны, тэрыторыі якіх увайшлі ў склад Жыткавіцкага. Толькі гранітныя Мікашэвічы адышлі да Лунінеччыны.




PHOTO.BYMEDIA.NET



Габрэйскім могілкам у Леніне – паўтысячы гадоў. Такіх драўляных помнікаў няма болей нідзе.

тэчка Азёрнае і вёска Белая. Скрозь іх ідзе адна суцэльная вуліца, а вакол — вада. Бялюткі азёрны пясочак, рэшты старадаўніх бароў ды паркаў пры колішніх панскіх сядзібах і савецкіх дамах адпачынку. Зачыненыя турбаза і піянерлагер, аднак, дагляданыя. Савецкі second best — з намаляванымі нерэідамі і Пасейдонамі, разнымі кракадзіламі і клумбамі. Зрэшты, тут можна уладкавацца на адпачынак і ў хатах. Сапраўдная рыбалка, свежыя малако ды гародніна ў дадатку.

Народ тут, як усюды пры вялікай вадзе — смелы і самастойны. Разгаварыўшыся, багата чаго можна дазнацца. Напрыклад, што ўсю тутэйшую гаспадарку завёў яшчэ пан Альшалоўскі, чыю колішнюю сядзібу спалілі партызаны. Тут шмат распаведаў і пра польскую мяжу, і пры бандытаў у ваколіцах. Мова тут сакавітая. Гаворкі тутэйшыя, тураўскія, цэласныя, гарманічныя. Мякчэйшае «ч» ды не такое пукатае, як паўсюль, «аканне». Можа, такою яна была ўжо ў часы князя Тура?

### За Прыпяць

Калі з Жыткавіч ехаць наўпрост на поўдзень, краявід яшчэ раз зменіцца: наўкола разляжацца пляскатая бы абрус раўніна. Асушаная і месцамі разараная. І за кіламетраў дзесяць адчуваецца подых Прыпяці. Месцамі рэдкія пералескі ды курганы, як ля вёскі Боркі, яшчэ мацней падкрэсліваюць веліч прыпяцкіх разлогаў. Паплавы, чараты — ні душы вакол. Ціша. Адно на досвітку крычаць птушкі.

За шырачэннай Прыпяццю, на вышэйшым паўднёвым беразе, наадварот, паселішчы шчыльна забудаваныя, туляцца, пераходзяць адно ў адно да самых Азяранаў.

А за Азяранамі, за могілкамі і крыжам, пачынаецца славуты стары Прыпяцкі запаведнік. Пры Лукашэнку ён стаў нацпаркам. У старажытным лесе завялося дрэвапераапрацоўчае прадпрыемства, што выпускае паркет, дошку, вагонку, выкарыстоўваючы як сыравіну Прыпяцкія дубровы. Нарабілі забавак для турыстаўпаляўнічых. Але прырода і гэтае нашэсце пакуль трывае. Бо ўвадначассе змяншаецца гаспадарчая дзейнасць на вёсках. Людзей становіцца ўсё меней. Тут, у палескай глушы, ужо не рэдкія чорныя буслы ды белыя чаплі. Цяпер тут ходзіць ужо сотня зуброў, багата ласёў, аленяў ды розных драпежнікаў. Самому без зброі ў лес лепей не хадзіць. Вось тут адчуваецца, як далёка заехаў.

У запаведніку пачынаецца ўжо і Лельчыцкі раён. У лельчыцкіх лясах зберагаюцца дубы-волаты, дзікія журавінавыя балоты. «Лель» на тутэйшым дыялекце — бусел.

На нечакана добрай дарозе стаяць рэдкія, але большыя вёскі. Вось старажытны Тонеж, слынны песнямі ды майстрамі. Дзеіць тут філіял Лельчыцкай школы мастацтваў. Усё культурна: школа, бібліятэка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, пошта, нармальныя крамы. Проста беларуская лясная казка. У Тонежы можна і набыць штонебудзь: прадуць, ткуць, шыюць-вышываюць.

А ў суседніх Прыбалавічах стаіць прыгожая царква, найстарэйшая ў тутэйшых краях. Сціплая звонку, але шыкоўная ўсярэдзіне. Як беларуская душа... Яна ведамая, прынамсі, з1794 г., адзіная што ацалела ў вайну і дзейнічала ад 1941 году да нашых дзён у Лельчыцкім раёне. Тут зберогся першапачатковы іканастас у духу ракако, старыя абразы, а на падворку — архаічныя каменныя крыжы.

Прыбалавічы ведамыя ажно з 1431 г., калі вялікі князь Свідрыгайла падарыў яго князю Міхаілу Чартарыйскаму. Так паўставала трывалая мяжа між Беларусяй і Украінай, што амаль не змянілася да нашых дзён.

Як і мяжа паміж Брэстчынай і Гомельшчынай. У суседнюю Брэстчыну, у Столінскі раён — ніводнай дарогі. Так не правялі іх, не злучылі, за ўсё XX стагоддзе.

### Скалы на мяжы

А Украіна зусім блізка. Туды вядзе вялікая і адзіная шаша. Туды ездзяць часта. Нават на роварах. З вялікіх Глушкавічаў туды ездзяць людзі штодня ў крамы. Там танней.

А пры самай мяжы знянацку паўстаюць скалы. Вялікія гранітныя скалы, нібы на Каўказе.

Напамінам пра даўніну засталіся тут шматлікія каменныя крыжы са сцёртымі надпісамі і паўсцёртымі свастыкамі. Яны калісьці стаялі ў вуглах царкоўнага цвінтара. Дзіўна глядзяцца тыя архаічныя свастыкі ў адной загародцы з абеліскам землякам-ахвярам вайны. Зоркі і свастыкі.

У Глушкавічах за царом жылі таксама палякі і немцы. Улады БССР давалі дазвол на пасяленне немцаў-каланістаў на паўднёвых глушкавіцкіх хутарах. Гэтак, у 1924 г. у хутары Нямецкі Млынок налічвалася 25 чалавек.

У вайну нацысты тройчы нішчылі вёску. Цудам засталіся толькі дзве хаты ад лесу... Цяпер за нямецкія грошы тут пабудавана вялікая мураваная царква. Немцы тут частыя госці, прывозяць, дараць што могуць.

У 1975 годзе тут было створана прадпрыемства «Граніт». Сёння вакол Глушкавічаў — гранітныя кар'еры, што сягаюць глыбінёю часам 30—35 метраў. У выніку нядаўняй рэканструкцыі шчэбнева-гранітны завод ператварыўся ў магутнае прадпрыемства, дзе працуе кожны пяты тутэйшы жыхар.

Вось чаго не чакаеш пабачыць у палескіх балотах, дык гэта такіх скалаў, з якіх відаць неабсяжную Украіну.

*Ленін—Юркевічы—Белая—Боркі—Азяраны—Тонеж—Букча—Прыбалавічы—Глушкавічы*

**Фота Сяргея Харэўскага, Алеся Матафонава**



Старажытныя каменныя крыжы з салярнымі знакамі ў Глушкавічах абламавалі бетоннай пліткай.

Палешукі – дасціпны і вясёлы народ, калі пазнаёміцца з імі бліжэй. Жыхары вёскі Белае, беларускай Венецыі.



Добрых падарожжаў у невядомую Беларусь зычыць «НН»!

# Жывапіс і шпакоўні Алеся Пушкіна



**У мінскай кавярні «Добрыя мыслі» (Магілёўская, 12/1)** працуе выстава творчасці мастака з Бабра (Крупскі раён) Алеся Пушкіна. Апроч карцінаў там можна пабачыць шпакоўні, якія мастак, у межах свайго праекту, ствараў для розных сацыяльных групаў беларускага грамадства: ёсць нават для аграгарадкоў і для Драздоў.

## ВЫСТАВЫ

**Мінскі альбом № 1**

**Да 20 красавіка ў галерэі «Свет фота» (Прытыцкага, 10)** працуе фотавыстава Валерыя Вядрэніо «Мінскі альбом № 1 (2009)».

**Кава і крыху Кубы**

**Да 4 красавіка ў «Падземцы» (пр.Незалежнасці, 43)** працуе выстава «Кава і крыху Кубы». Фотаздымкі з «Выспы Свабоды» Дыяны Шык.

**Уладзімір Кожух**

**У мастацкай галерэі «Ласандр-арт» (Раманаўская Слабада, 24) да 18 красавіка** працуе персанальная выстава жывапісу Уладзіміра Кожуха.

**Белая ружа**

**У Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Кастрычніцкая плошча) да 30 красавіка** працуе выстава «Белая ружа», прысвечаная студэнцкаму супраціву гітлераўскаму рэжыму ў Мюнхене ў 1942—1943 гг. Выстава расказвае пра дзейнасць нямецкіх студэнтаўмедыкаў, якія распаўсюджвалі антыгітлераўскія ўлёткі ад імя «Белай ружы».

**Работы Ілaрыі Вечар і Дзмітрыя Зайцава**

**Да 30 красавіка ў абласной бібліятэцы імя Пушкіна (Гікалы, 4)** працуе выстава твораў Іларыі Вечар і Дзмітрыя Зайцава. Экспазіцыя бацька Іларыі Вечар носіць назву «Канон». На ёй паказаная калекцыя абразоў, напісаных на аснове іканаграфічнай візантыйскай школы, закладзенай апосталам Лукам. Працы Дзмітрыя Зайцава на выставе аб'яднаныя ў экспазіцыю «Адпачатнае» (бяроста). Гэта свайго кшталту роздум на тэму простых рэчаў...

**200-годдзю Гогаля прысвячаецца...**

**Да 14 красавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы** працуе выстава, прысвечаная 200-годдзю Мікалая Гогаля.

**Яна мая...**

**У Музеі сучаснага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 13 красавіка** працуе выстава скульптуры і фатаграфіі «Яна мая...».

**Графема**

**У Літаратурным музеі Янкі Купалы (Янкі Купалы, 4) да 5 красавіка** працуе выстава «Графема» — калаж арт-праектаў беларускіх мастакоў, у кожным з якіх у той ці іншай форме прысутнічае тэкст.

**Выстава Барыса Аракчэева**

**У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (Багдановіча, 7а) да 8 мая** працуе мастацкая выстава Барыса Аракчэева «Мая Яраслаўія». Мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю Максіма Багдановіча, знайшлі адлюстраванне ў творчасці Барыса Аракчэева. У фондах Літаратурнага музею Максіма Багдановіча захоўваюцца яго карціны — «Гады вучобы ў гімназіі», «Апошняя вясна ў ліцэі», «Дом у Яраслаўлі», «Яраслаўль. Сажалка ў Карабісе. Па сцежках М.Багдановіча».

## ІМПРЭЗЫ

**Першы Купалаўскі слэм**

**5 красавіка ў літаратурным музеі Янкі Купалы (Я.Купалы, 4)** адбудзецца Першы Купалаўскі слэм. У паэтычным спаборніцтве ўдзельнічаюць Віктар Жыбуль, Вера Бурлак, Віталь Рыжкоў, Глеб Лабадзенка і многія іншыя творцы. Вядзе імпрэзу Андрэй Хадановіч. **Пачатак а 15-й**

**Еш не еш — усё адно пампрэш**

**3 красавіка паэтычны тэатр «Арт. С» у бібліятэцы Цёткі (Талбухіна, 12а)** запрашае на шкодную вечарынку «Еш не еш — усё адно пампрэш». Чакаюцца найсмачнейшыя выступы 2009 году: Пятро Васючэнка, Алена Масла, Юрась Пацюпа, Людміла Рублеўская, Аляксей Чубат і інш. Да таго ж смакотныя песні Яраша Малішэўскага, Сержа Мінскевіча і Юрыя Несцярэнкі. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны

**Літаратурная імпрэза на Вербным кірмашы**

Паэтычны тэатр «Арт.С» і Сацыяльны аддзел Мінскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы прадстаўляюць **11 красавіка а 15-й на «Вербным кірмашы»** літаратурную імпрэзу «Мой родны кут». Прысвячаецца роднай зямлі, прыродзе, нашай мове і шчырым беларусам. Удзел бяруць пісьменнікі Валянціна Коўтун, Зміцер Арцюх, Мікола Кандратаў, Тацяна Пратасевіч, Аксана Спрынчан, артысты тэатру «Арт.С», фальклорны калектыў «Ягняткі». **Імпрэза пройдзе ў Палацы мастацтваў (Казлова 3).** Уваход вольны

**Сустрэча з маладымі паэткамі**

**10 красавіка ў бібліятэцы № 12 (Маякоўскага, 164)** адбудзецца творчая сустрэча-імправізацыя з дзвюма маладымі паэткамі — Алёнай Беланожкай і Вікай Трэнас. У вечарыне возьме ўдзел бард Наталля Пушкарова. Спецыяльны госць — музыка, лідэр гурту White Night Blues Юры Несцярэнка. **Пачатак а 16-й.** Уваход вольны

## КАНЦЭРТЫ



**Вайцюшкевіч у Маладзечне і Мінску**

**3 красавіка ў Маладзечне ў абласным драматычным тэатры (Чкалава, 7)** пройдзе канцэрт Змітра Вайцюшкевіча. **Пачатак у 19.00.**

**7 красавіка** артыст выступіць **у Мінску, у клубе «Графіці» (зав.Калініна, 16). Пачатак** таксама **ў 19.00**. Колькасць месцаў абмежаваная.

**Znich у «Рэактары»**

**3 красавіка ў клубе «Рэактар» (Харужай, 29)** — сумесны канцэрт фолк-метал гуртоў **Znich** (Беларусь) і **«Северные Врата»** (Расія) з прэзентацыяй новых праграм. **Пачатак а 19-й.** Квіткі 20—40 тыс. рублёў. Даведкі праз т.: (029) 649-08-88.

**Drum Ecstasy**

**2 красавіка ў «Гудвіне» (пр.Незалежнасці, 19)** — «Drum Ecstasy». **Пачатак а 20-й**

**Палац**

**2 красавіка а 20-й у «Дэжавю» (Валадзько, 6)** — «Палац» — з праграмай «Танчыць Палац».

**Рокаш**

**14 красавіка а 19-й у «Графіці»** — канцэрт «Рокашу».

**Эдуард Акулін у Ляхавічах**

**2 красавіка** паэт, бард Эдуард Акулін выступіць у Ляхавіцкім цэнтры пазашкольнага выхавання. **Пачатак а 11-й.**

**Crivia Aeterna: Архаіка і Сучаснасць**

**12 красавіка ў «Стэпе» (Прытыцкага, 62)** — музычны фэст «Crivia Aeterna: Архаіка і Сучаснасць». **Пачатак а 17-й**

## ТЭАТРЫ

### 2 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Тэатр юнага гледача** — «Пацалунак ночы»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Калі скончыцца вайна»
**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»

### 3 красавіка

**Тэатр імя Янкі Купалы** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»
**Тэатр юнага гледача** — «Папялушка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Калі скончыцца вайна»
**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»
**Тэатр оперы і балета** — «Лебядзінае возера»

### 4 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Купалаўскі тэатр** — «Макбет»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»
**Музычны тэатр** — «Айбаліт-2002»
**Тэатр юнага гледача** — «Шчаўкунок»
**Музычны тэатр** — «Даратэя»

### 5 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Купалаўскі тэатр** — «КІМ»
**Музычны тэатр** — «Залатое кураня»
**Тэатр оперы і балету** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Музычны тэатр** — «Бунт баб»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

### 6 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Адчыніце кантралёру!» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «Слуга двух гаспадароў»
**Тэатр беларускай драматургіі** — Тэатр сучаснай харэаграфіі «D.O.Z.SK.I»

### 7 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Івона, прынцэса Бургундская»
**Тэатр оперы і балету** — «Casta Diva»: Ніна Шарубіна
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»
**Музычны тэатр** — «Бунт баб»

### 8 карасавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраунд»
**Тэатр оперы і балету** — «Карміна Бурана», «Кармэн-сюіта»
**Музычны тэатр** — «Прынцэса цырку»

### 9 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Іванаў»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

### 10 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»

### 11 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Дамскае танга» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»
**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і брадвей»
**Музычны тэатр** — «Вясёлая ўдава»
**Тэатр оперы і балету** — «Стварэнне свету»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»

### 12 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта (Інтымны дзённік)»
**Музычны тэатр** — «Дон Кіхот»
**Тэатр оперы і балету** — «Вечар вальсу»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Юленька

Расія, 2009, каляровы, 97 хв.

**Рэжысёр:** Аляксандр Стрыжанаў

**Жанр:** Фільм жахаў паводле сцэнару Андрэя Курэйчыка

**Адзнака:** 6 (з 10)

28 сакавіка Андрэй Курэйчык прадставіў для журналістаў стужку, пастаўленую па сваім новым сцэнары. Карціна «Юленька» — гэта фільм жахаў.

Настаўнік з жонкай і падчаркай прыязджае ў правінцыйны гарадок, каб выкладаць у жаночай гімназіі. Але з класам нешта не так: таемныя змовы, маўчанне — і ціхае зло. Аднойчы герой атрымлівае цыдулку: «Выратуйце нас!» Але ратаваць прыйдзецца яго самога. Герой сутыкнуўся з Юленькай — надзвычай помслівай 11-гадовай дзяўчынкай з недзіцячым розумам, якая гуляе людзьмі як лялькамі.

Карціна выклікае супярэчлівыя ўражанні.

Падбор актораў паспешлівы, асабліва не ўпісваецца ў стужку Марат Башараў (настаўнік), які выглядае суцэльным мямлем.

Над сцэнаром Андрэя Курэйчыка працавалі і жук і жаба, што не пайшло на карысць фільму.

Але, нягледзячы на ўсё гэта, жанравае кіно здзейснілася. У асобных момантах — фільм страшны да вусціш: вар'ятка, выдраны хрыбет, чорныя вочкі дзетак.

«Я хацеў, каб зло выглядала звычайным», — кажа Курэйчык, які «спісаў» вобраз ведзьмы з сяброўкі дзяцінства. У кінакампаніі «XX век Фокс» аценілі патэнцыял стужкі і набылі правы на яе рэмэйк.




Для беларускага пракату карціну плануюць закупіць, а пакуль яна даступная на лічбавых дысках.

**Андрэй Расінскі**

# «Белсат»: тэлепраграма на 6 красавіка—12 красавіка
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 6 красавіка, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял: 20 серыя
**19.00** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Багі»
*У якіх багоў верылі нашы продкі, перад тым як на беларускіх землях распаўсюдзілася хрысціянства?*
**19.10** «Незалежныя», дак. фільм, рэж. Яцэк Тальчэўскі, 2006 г., Польшча
**20.05** Тыдзень з радыё «Свабода»
**20.40** «Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў», 5 серыя: «Энэргетычная бяспека»
*Як супольнасць краінаў з энэргаёмістаю гаспадаркаю — Еўрапейскі Саюз рупіцца пра сваю энэргетычную бяспеку. Заходняй і Цэнтральнай Еўропе трэба ўсё больш нафты і прыроднага газу. З прычыны таго, што ўласных энэргарэсурсаў не стае, Еўрапейскі Саюз — найбуйнейшы на свеце імпарцёр энэрганосьбітаў. Што робіць «адзіная Еўропа», каб загарантаваць усім дзяржавам-чальцам бесперапынны нафтагазавы імпарт?*
*Праграма падрыхтаваная на аснове матэрыялаў Еўрапейскай камісіі.*
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** Хто ёсць кім?: Адвакат капіталізму
Яраслаў Раманчук — палітык і эканаміст, намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Кіраўнік Навукова-даследчага цэнтру Мізэса, аналітычнага цэнтру «Стратэгія».
*«Фінансавы крызіс нас не праміне... Мы не Рабінзон Круза, у якога нічога няма, акрамя казы і пары папугаяў. Мы таксама ў гэтай сістэме. Залежым ад крэдытаў, рынкаў збыту, ад таго, як купляюць нашыя тавары, колькі грошай маюць беларусы... І гэты крызіс у нас ужо пачынаецца: у банкаў не хапае грошай, адсоткі па крэдытах выраслі. Людзі вымушаныя будуць зацісnumь паясы з-за непрафесійнасці ўраду, які не валодае сітуацыяй. Нават ужо Лукашэнка выказвае меркаванні накшт лібералізацыі рынку, але не ведае, як гэта зрабіць. Несумненна, улада нас пакліча, ёй спатрэбіцца наш досвед. Гэта пытанне часу, гэта можа быць не заўтра, але праз год мы будзем кіраваць краінаю, гэта непазбежна».*
**21.35** Фільматэка майстроў: «Угару, уніз», маст. фільм, рэж. Ян Гржэбэйк, 2004 г., Чэхія
**23.25** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 8 серыя
**00.10** Аб'ектыў (навіны)

### 7 красавіка, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 8 серыя
**18.55** «Мы вольныя людзі», дак. фільм, рэж. Пётр Стэц, Томаш Марцінец, 2008 г., Польшча
**19.45** «Сталін. Смерць дыктатара», дак. фільм, рэж. Гэльге Трампэрт, Інга Вольфрам, 2003 г., Германія
**20.40** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Фотааматар», дак. фільм, рэж. Дар'юш Яблоньскі, 1998 г., Польшча
*У 1987 г. у Вене сярод антыкварыяту знайшлі некалькі соцень каляровых слайдаў часоў II сусветнай вайны. Аказалася, што яны паходзяць з гета Лодзі. Зафіксаваныя на слайдах кадры сталі падставаю для стварэння фільму, у які ўвайшлі ўспаміны адзінага жывога сведкі тых падзеяў.*
**22.20** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.45** «Рок назаўжды», дак. фільм, 2008 г., Беларусь, ч. 2
**23.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 9 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 8 красавіка, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 9 серыя
**18.55** «У пошуку ідышу», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2008 г., Беларусь
**20.30** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** YoLife! (моладзевая праграма)
**21.35** Госць «Белсату»: Павел Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**21.55** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Багі»
**22.00** Форум (ток-шоу): Краіна ў запоі.
**22.45** «Мент», дэтэктыўны серыял: 25 серыя
**23.30** «Я бачыла «Рассвет», дак. фільм, рэж. Марыя Вернікоўская, 2000 г., Польшча
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 9 красавіка, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял: 25 серыя
**18.55** Рэпарцёр (публіцыстычная праграма)
**19.20** «Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў», 5 серыя: «Энэргетычная бяспека»
**19.35** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Ноч з генераламі», дак. фільм, рэж. Мар'я Змарз-Качановіч, 2001 г., Канада
**20.20** Маю права (праварая праграма)
**20.35** Кухня (музычная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.30** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**22.00** Інтэрнаўты выбіраюць
**22.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял, рэж. Ян Сэбэхлебскі, 2006 г., Чэхія: 1 серыя.
*Ці можна паказаць гледачу што-небудзь новае з жыцця дактароў? Так, вядома. Асаблівa, калі справа датычыцца дактароў жаночай кансультацыі і калі адзін з іх мужчына. Тут праблемы ўзнікаюць не толькі ў кабінеце, дзе прымаюць пацыентак, але і па-за ім. Галоўныя героі серыялу — медыкі першай у горадзе прыватнай жаночай кансультацыі: медсястра Каміла і лекары Міхал і Гіта.*
**23.35** З архіву Jazz Jamboree: Michele Rosewoman New Yoruba, ч. 1
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 10 красавіка, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 1 серыя
**18.55** «Старыя Кросны», дак. фільм, рэж. Юрый Выдронак, 2007 г., Польшча
**19.10** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.35** «Аблічча смерці», дак. фільм, рэж. Карл Людвіг Рэтынгер, Габрыеле Пфайфэр, 2005 г., Германія—Расія
**20.30** Кінастужка (агляд кінарынку)
**20.45** Беларусы ў Польшчы
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»: Павел Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**21.35** «Краявід пасля бітвы», маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда, 1970 г., Польшча. У галоўных ролях: Даніель Альбрыхскі, Станіслава Цэлінська.
Гэтая псіхалагічная драма атрымала «Залаты глобус» на II Міжнародным кінафестывалі ў Мілане і «Залатую гронку» на фестывалі ў польскім Лагаве ў 1971 г.
*У 1945 г. амерыканскія войскі вызваляюць вязняў з нямецкага канцлагеру, абяцаючы, што хутка яны змогуць вярнуцца дадому. Былых нявольнікаў вывозяць у лагер для перамешчаных асобаў. Маладому паэту Данієлю цяжка жыць з успамінамі лагернага жыцця. Ён ненавідзіць немцаў. Маладая польская габрэйка Ніна спрабуе дапамагчы яму пераадолець гэты хваравіты неспакой. Яна выцягвае яго на шпацыр за межы лагеру, прапаноўвае сваё каханне і эміграцыю. Але пры вяртанні ў лагер Ніну выпадкова забіваюць амерыканскія жаўнеры, і для Данієля гэтая смерць лагічна ўкладаецца ў той безнадзейны ланцуг бессэнсоўных смерцяў, якія прынесла вайна.*
**23.15** «На поўных абаротах», серыял: 4 серыя
**23.45** «Містэрыя Божае пакуты на Познанскай цытадэлі», рэж. Артур Пятроўскі, 2007 г., Польшча, ч. 1
*«Містэрыя Божае пакуты» — самы вялікі спектакль у Еўропе. «Містэрыя» праводзіцца сёлета восьмы раз у Познанскай цытадэлі намаганнямі ордэну салезіянаў і асабіста Артура Пятроўскага, рэжысёра, сцэнарыста і аўтара ўсіх імпрэзаў. «Містэрыя» доўжыцца 67 хвілінаў. Гэта поўнае драматычнасці захапляльнае відовішча пра смерць і ўваскрасенне Ісуса Хрыста. У паказе ўдзельнічае каля 1000 чалавек, 300 акtoраў, 300 харцэраў і 300-асабовы хор з сімфанічным аркестрам.*
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 11 красавіка, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.40** «Невядомая Беларусь»: «Дарога да пекла. Атрута», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**19.10** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.40** Канцэрт царкоўнай музыкі, ч. 1
**20.10** «ПНР дэ люкс», дак. фільм, рэж. Эдыта Врублеўска, 2007 г., Польшча
**20.30** Кружэлка (сусветная музыка)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.10** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**21.40** Суботні сеанс: «Вакол свету за восемдзесят дзён», маст. фільм, рэж. Баз Кулік, 1989 г., ЗША—Югаславія. У галоўнай ролі Пірс Броснан.
*Трохсерыйны прыгодніцкі фільм па матывах раману Жуля Верна.*
**23.15** «Званы Беларусі», дак. фільм, 2008 г.
**23.45** «Містэрыя Божае пакуты на Познанскай цытадэлі», рэж. Артур Пятроўскі, 2007 г., Польшча, ч. 2
**00.00** Аб'ектыў (навіны)




### 12 красавіка, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.15** «Ранча», серыял: 21 серыя
**19.05** Канцэрт «Салідарныя з Беларуссю», ч. 1
**20.00** «Без рэтушы»: «Белы ветразь над Прыпяцю», дак. фільм, рэж. Уладзімір Колас, 2008 г., Беларусь
*Такой яхты, як у Яўгена Шатохіна, няма ні на Прыпяці, ні на Сажы, і ўвогуле ў цэлай Беларусі. Ён перарабіў яе са старога ратавальнага судна II сусветнай вайны, якое прывёз чыгункай з Расіі. Каб ніхто падчас транспартавання судна яго не пашкодзіў і не скраў, Шатохін з сябрамі таемна схавалія ўсярэдзіне. Так ехалі тыдзень з Масквы ў Гомель, хаваючыся ад чыгуначнікаў. Калі катэр прывезлі ў Пінск, Шатохін наняў працаўнікоў, якія давялі судна да ладу, узняў белы ветразь і стаў плаваць па Прыпяці і Дняпры.*
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Курганы»
**21.30** Фільматэка майстроў: «Апошні імператар», маст. фільм, рэж. Бэрнарда Бэртолуччы, 1987 г., Брытанія—Кітай—Гон-Конг
*Паміраючы, старая імператрыца Паднябеснай вырашае, што наступным імператарам і «Сынам Неба» стане трохгадовы Пу-І, якога забіраюць з роднага дому ад матулі і адвозяць у Забаронены горад. А па-за межамі Забароненага гораду Кітай становіцца Народнаю Рэспублікаю, аднак унутры імператарскага палацу ўсё па-ранейшаму: імператара-дзіцця абагаўляюць, яму дазваляюць любыя забавы, але ён не мае ніякай улады і становіцца закладнікам ва ўласным палацы. Кім стане дарослы Пу-І?*
**00.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)

ПРЭМ'ЕРА

# Мікі Рурк камбэкнуўся

**Трыумфальнае вяртанне Мікі Рурка здзейснілася стужкай «Рэстлер». Піша Павал Касцюкевіч.**

Амерыканскія пастановачныя баі: барацьбіты скачуць адзін аднаму на спіну і грудзі, б'юць шыбы адзін у аднаго на галаве, лупяць па нырках, выдзіраюць з жывых жылы — і ўсё гэта не папраўдзе. «Не папраўдзе? — перапытвае герой Мікі Рурка, баец бэз правілаў Рэндзі «Таран». — Я табе пакажу «не папраўдзе»...». І стужка пачынаецца: гісторыя ўдзельніка несапраўднага спорту, ад якога руйнуецца цела і душэўны спакой; чароўнай пастаноўкі, ад якой нішчыцца сям'я (герой мае дарослую дачку, але не вельмі добра памятае, калі ў яе дзень народзінаў); гульні, якая не дае дазволу нават на шчырае каханне.

«Рэстлер» — рэмэйк, які паўтараецца з пакалення ў пакаленне: адвечная песня пра спробу вяртання да ўласных вяршыняў. Пра пакліканне, улюбёную справу, і яе высокую цану. Усё астатняе толькі мода: рэалістычны стыль здымання, калі камера нібы дыхае ў патыліцу, меланхалічны электрагітарны перабор на тле. «Рэстлер» — сюжэт, на які заўжды будзе знойдзены герой і заўсёды прыйдзе глядач. «Рокі», «Алі», «Бой з ценем». Усе ведаюць фінал наперад і ўсё адно глядзяць, прыглядаюцца, прымерваюцца: не выключана, што і самім колісь давядзецца здзейсніць свой камбэк.



Нягледзячы на крыклівую рэкламу, гэта сціпшаны, асабісты фільм: прыватны аповед пра прыватнага чалавека. «Рэстлер» гэтаксама можа называцца «Спявак», «Паліцэйскі», «Гоншчык», «Актор». Цікава паназіраць, як у сваіх сёлетніх інтэрв'ю Мікі Рурк, які гадоў трынаццаць нідзе толкам не здымаўся (не было прапановаў), амаль не размяжоўвае сябе і свайго новага героя.

Паглядзеўшы «Рэстлера», лепей разумееш наркатычную сутнасць сцэны/рынгу і нават пачынаеш хай сабе трошкі, але ўсё ж уважлівей прыглядацца да Алы Пугачовай, з яе нібыта фальшывымі сыходамі і вяртаннямі.

Чаму варта глядзець гэты фільм:

1. Дзеля сцэны ў супермаркеце, у якой Мікі Рурк, нацягнуўшы стэрыльны чэпчык, працуе ў мясным аддзеле. Яго ганяюць туды-сюды ўедлівыя амерыканскія пенсіянеры. Сцэна знятая з-за прылаўка: стуль пачынаеш разумець лепей работнікаў гандлю, а ад дапытлівасці акtoраў-пакупнікоў сатанееш сам.

2. Каб паглядзець падыспад, «кухню» пастановачных баёў. «Тут я лупану табе ў твар, а потым ты гахнеш мне па спіне». Ага, вось так усё гэта ў іх робіцца...

3. Дзеля мікірурккаўскай фрызуры (Карабельныя вяроўкі? Гадзюкі Медузы-Гаргоны? Тайландская яечная локшына?)



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Лукашэнку не далі згарэць, але патапталі. Увечары 25 Сакавіка ля Акадэміі Навук моладзь распаліла вогнішча з партрэтаў ППРБ. Агонь затапталі начальнік упраўлення аховы правапарадку МУС Аляксандр Барсукоў і лідэр БНФ Вінцук Вячорка, які палічыў спаленне правакацыяй. Больш фотаў з Дня Волі — старонка 6.**

## ЛІТАРАТУРА

# Рэцэпт цуду

**Вера Рыч.**
Блюз пра беларускую нацыю.

Спачатку вазьмі зямлю –
Калі на мапе даўно белых плямаў няма, дык шукай
Зніклую, выедзеную, выпетраную, выдзяўбаную
Дашчэнту суседзямі; потым дадай сюды мову,
Ужываную хіба дзеля прымаўкі; дамяшай гісторыю,
Што выкладаецца як гісторыя іншых; ды народ,
Які доўга вучыўся не помніць гісторыі, нацыі, мовы...
Вымясі гэта, і дай падысці...

Тады вазьмі
Сцяг простых колераў, колераў косткі
І крыві, хлеба і віна, вады і агню,
Колераў веры й любові; дадай яшчэ сімвал,
Адрынуты й забаронены (да таго ж, карыстаны суседам);
Вылі туды поўную меру слёз, ачышчаных ад смутку,
Старога й новага, цень трох бярозаў, дзе б мусілі стаяць чатыры,
Жыцці, зачатыя пад Зоркай Палын,
Косткі, гузікі й кулі ў кветках–курапатах;
Змяшай гэта ўсё, кроплю па кроплі,
У кубку часу...

Тады, у прызначаны дзень
(Ты пазнаеш яго, дружа, ты пазнаеш), калі свет глядзіць
У іншы бок, вазьмі кубак і далікатна, вельмі далікатна,
Пералі сумесь у паднятае цеста,
І выпякай яго ў печы Кліо...

Хтосьці адразу пачне
Нагадваць пра асцярожнасьць, пра тое, што блізка зіма,
Што цяпло і святло набываюцца ад заможнага суседа,
Пра пустыя майстроўні, вырабы якіх ніхто не купіць,
І пра свет, якому зазвычай напляваць...

Не зважай на гэтыя перасцярогі, дружа! Вымай свой бохан,
Загарні яго ў лён, спаві яго валошкамі,
Тады гукай сяброў (яны ўсе станучца сябрамі ў той дзень,
Сямікроць сем і болей) і абвясці, што йдзеш
Заняць сваё крэсла на іхнай бяседзе.

**Аўтарызаваны пераклад з англійскай
Бэлы Перкінай-Аксельрод**



**Вера Рыч**

нар. 24 красавіка 1936 у Лондане. Англійская паэтка, перакладчыца, журналістка і гісторык. Пад уплывам біскупа Чеслава Сіповіча пачала перакладаць беларускія вершы. Аўтарка зборніку «Як вада, як агонь» (Like Water, Like Fire) — першай у свеце анталогіі перакладаў вершаў беларускіх паэтаў на англійскую мову, які быў забаронены ў СССР у 1972 г., і зборніку The Images Swarm Free — падборкі перакладаў Алеся Гаруна, Максіма Багдановіча і Змітрака Бядулі. Прапагандуе беларускую культуру на Захадзе. Працуе з англійскім перакладам «Новай зямлі» Якуба Коласа.

## ЖАРТЫ

* * *

Цырк. Дрэсіроўшчык на арэне становіцца на калені перад львом:

— Ты мусіш скакаць праз кола! Скакаць, а не дзьмухаць...

* * *

Пракаповіча сустракае рабаўнік і камандуе: «Рукі ўверх, аддавай усе свае грошы!» Пракаповіч абурана тлумачыць, што ён кіраўнік Нацбанку. «А-а-а — ну тады ўсе мае грошы аддавай!» — патрабуе гангстэр.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**М. Ганушыкі Троцк. пав. Віленск. губ.** Калі адкрывалася ў в. Дусмяны вучылішча, то мужыкі прасілі, каб ім далі вучыцеля каталіка; мужыкі тут усе каталікі. Але, нягледзячы на гэта, ім прыслалі хаця і добрую вучыцельку, але праваслаўную. Яшчэ няма закону, каб беларусы каталікі былі вучыцелямі народнымі. Змяніць гэты несправядлівы парадак можа толькі Дума, але хіба не трэцяя.

**Падарожны**
**«Наша Ніва». №13—14. 1909**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### СПАЧУВАННІ

**Спачуваем прафесару Андрэю Вардамацкаму** ў сувязі са смерцю мамы, Алены Паўлаўны. Калегі з БІСД, «Нашай Нівы», ARCHE, «Будзьма»

**Колькі ведаў Алега Белавусава**, заўсёды шчыра шанаваў і светлую памяць захаваю ў сэрцы колькі сам жыцьму. Мае шчырыя спачуванні родным і блізкім Алега. Васіль Сёмуха

**Шчырыя спачуванні родным Алега Белавусава..** Як цяпер памятаю перадачу «У бары ў Алега»... Пятрусь

**Алег Белавусаў...** Чалавек інтэлектуальны, таленавіты, шматгранны, наш чалавек, чалавек волі, якіх адзінкі. Я адчуваў, што яму нядоўга засталося. Такія Людзі не жывуць, а гараць. Асобна запомнілася ягоная тэлеперадача–гутарка з Кімам Хадзеевым, таксама нашым, вольным, не рабом. А як добра, лёгка, захапляльна чыталася... не! — чытаецца яго проза... Спачуванне родным, сваякам. Леанід Маракоў

### КНІГІ

**Шукаю** 26–27 і 29–30 нумары «Нашай Нівы» за 1997 год. Т.: 227–43–70, 247–50–52, (029) 262–12–93. Марыя

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Выкладчыкі Беларускага Ліцэю запрашаюць

Бясплатныя курсы беларускай мовы, культуры, гісторыі з настаўнікамі Беларускага Ліцэю — сябрамі Таварыства беларускай мовы. Для вучняў 7—9 (9') класаў. Арганізацыйны збор **15 красавіка** 2009 г. а **18.00** на сядзібе ТБМ **(вул.Румянцава, 13, ст.метро «Плошча Перамогі»)**.

### Касцюкевіч у «Падземцы»

**2 красавіка ў галерэі «Падземка» (Мінск, пр.Незалежнасці, 43) ад 18 да 19 гадзін** Павал Касцюкевіч будзе стаяць за прылаўкам кнігарні «Логвінаў» і прадаваць кнігі. Свае і чужыя. Нядорага. Свае — з аўтографам.

Наша Ніва
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5640. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 31.03.2009.
Замова № 1725.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.
ISBN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12